

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ У ГАЗЕТУ? 7

У ЭКА ЎСЯГО АДЗІН НЕДАХОП... 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 СНЕЖНЯ 2018 г. СЕРАДА № 234 (28850)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ШАЎЦОЎ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў:**

*«Пацыентам варта дзякаваць урачам, адпраўляючы аб іх рабоце станоўчыя водгукі кіраўніцтву або ў Міністэрства аховы здароўя. Кіраўніцтва бальніцы або паліклінікі, праваахоўныя органы могуць няправільна вытлумачыць значэнне падарунка, калі ён будзе паднесены перад аказаннем дапамогі. Калі гаварыць пра падзяку пасля лячэння, то, думаю, гэта будзе ўспрынята адэкватна. Іншая справа, што пацыент павінен разумець: калі ён хоча выказаць сваю павагу ўрачу, то не трэба гэта рабіць тэт-а-тэт у выглядзе каробкі цукерак ці шакаладкі. Трэба зрабіць так, каб усе пра гэта ведалі: пакінуць запіс у кнізе падзяк, напісаць пісьмо на імя галоўнага ўрача, у вышэйшую інстанцыю».*

# КАРЗІНЫ АД АЛІНЫ



Як і раней, на Стаўбцоўшчыне плятуць адметныя, надзіва зручныя і практычныя кошыкі з сасновай дранкі. Адзін з такіх майстроў, можна сказаць, самабытнага пляцення Аліна ХАЛЯВІНСКАЯ ўжо каля пятнаццаці гадоў працягвае прыгожую карзіна-кашовую традыцыю. У вольны час, па вечарах альбо ў выхадныя Алініны рукі не ведаюць адпачынку: загадзя нарыхтаваную смалістую шчапу яны лоўка сплятаюць у сапраўдны мастацкі твор. Увесь зімовы час майстрыха будзе «варажыць» над вялікімі і малымі, квадратнымі і прамавугольнымі, на вядро, а то і на два — памер і аб'ём па жаданні заказчыка — кошыкамі, бо замоў на іх выраб у Аліны Антонаўны сапраўды на ўсю зіму хопіць.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **Больш за 90 прадпрыемстваў і арганізацый возьмуць удзел у навагодняй рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».**

• У Падмікольскім парку Магілёва 29 снежня адбудзецца навагодні лыжны забег «Самы хуткі Дзед Мароз».



• **Беларускі бок разлічвае, што пагадненне аб узаемным прызнанні віз паміж Беларуссю і Расіяй павінна ўступіць у сілу да 20 мая 2019 года.**

• Міністры фінансаў 19 краін еўразоны дасягнулі пагаднення па рэфармаванні валютнага саюза, які дзейнічае ў рамках ЕС.

У нагу з часам

## Паспець за «лічбай»

**У многіх школах шырокапалосны інтэрнэт выкарыстоўваецца толькі кабінетам інфарматыкі і адміністрацыяй**

**Ці можа толькі факт падключэння навучальнай установы да сеткі інтэрнэт або наяўнасць у ёй камп'ютарнага класа сведчыць пра тое, што гэта школа, каледж ці ВНУ актыўна ўключыліся ў лічбавую трансфармацыю? Што ўвогуле хаваецца за гэтым паняццем? Якія сусветныя трэнды ў трансфармацыі адукацыі проста недаравальна будзе праігнараваць? Пра ўсё гэта разважалі ўдзельнікі II Міжнароднай спецыялізаванай навукова-тэхнічнай выстаўкі-форуму «Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі» (ITE 2018), якая прайшла ў Мінску. За тры дні работы на ёй выступілі 72 спікеры — вядучыя беларускія і замежныя спецыялісты ў сферы інфарматызацыі. На пяці пляцоўках адбыліся найцікавейшыя канферэнцыі і «гарачыя» панэльныя дыскусіі. Форум наведалі 4,5 тысячы настаўнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў, прадстаўнікоў органаў кіравання сістэмай адукацыі і пастаўшчыкоў інфармацыйных тэхналогій.**



Павел ЛІС: «Хуткія рашэнні — асноўны рухавік лічбавай трансфармацыі».

СТАР. 5

Рэгіёны: па сутнасці справы

## ЯК ПАСЛУГІ СТАНОВЯЦЦА БОЛЬШ МАБІЛЬНЫМІ

**Каб жыхары нават самых аддаленых вёсак не адчувалі сябе забытымі**

СТАР. 8—9



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# ГАМАРДЖОБА, СЯБРЫ!

## Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з паслом Грузіі

**Нядаўна ў Грузіі прайшлі прэзідэнцкія выбары. Прэзідэнт Беларусі накіраваў віншаванне з перамогай на іх сваёй грузінскай калезе Саламэ Зурабішвілі. Першая ў гісторыі краіны жанчына-прэзідэнт набрала большасць галасоў у двух турах і стала апошнім кіраўніком дзяржавы, якога абралі ўсеагульным прамым галасаваннем. Дарэчы сказаць, Грузія — парламенцкая рэспубліка, але немалаважная роля належыць Прэзідэнту ў міжнародных сувязях. А ў Беларусі з Грузіяй яны маюць амаль чвэрцьвекавую гісторыю. За гэты час удалося наладзіць супрацоўніцтва ў палітычным, эканамічным і гуманітарным кірунках. Перспектывы ў двухбаковых адносінах краін і выбары новага Прэзідэнта абмеркавалі Аляксандр Лукашэнка і пасол Грузіі ў Беларусі Валерый Кварацхелія.**

«Якія б выбары ні былі — гэта важная палітычная кампанія, якая, як лакмусавая папера, прасвеціць грузінскае грамадства, да чаго яно схіляецца сёння, у якім кірунку гатовае рухацца і гэтак далей. Неабыякія ішлі баталіі», — сказаў Прэзідэнт, адзначыўшы, што сачыў за выбарамі і атрымліваў інфармацыю ад СМІ і беларускага пасольства. Ён павіншаваў Валерыя Кварацхелію і ўвесь грузінскі народ з заканчэннем паспяховай выбарчай кампаніі.

Прэзідэнт Беларусі абсалютна задаволены супрацоўніцтвам з Грузіяй. «Фундаментам, як заўсёды, з'яўляецца эканоміка і гандлёва-эканамічныя адносіны. У нас і гандаль развіваецца. Мы пачыналі калісьці з нуля», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Зараз з афіцыйным візітам у Грузіі знаходзіцца віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы. «Мною прынята рашэнне, каб ён паехаў з нагоды пасольскіх пытанняў. Але галоўнае, каб ён правёў сустрэчы і яшчэ раз «зверыў» гадзіннікі пасля гэтага палітычнага перыяду і выбараў прэзідэнта. Гэта сведчыць пра тое, што мы вельмі вялікую ўвагу ўдзяляем сяброўскаму і брацкаму грузінскаму народу. І мы поўныя рашучасці прасоўваць гэтае супрацоўніцтва ва ўсіх сферах», — акцэнтаваў увагу беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што чакае сустрэчы з новым кіраўніцтвам Грузіі: «Пасля майго візіту там абнавіўся і ўрад, і будзе вельмі важна «зверыць» гадзіннікі».

Пасля размовы з Аляксандрам Лукашэнкам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Грузіі ў Беларусі Валерый Кварацхелія пагутарыў з журналістамі.

«Мы абмяркоўвалі палітычныя пытанні, дзе, у прынцыпе, у нас няма непаразуменняў. І мы як бы праводзім палітыку ўзаемаразумення і ўзаемадапамогі адзін аднаму. Былі пытанні па эканамічнай сітуацыі, і тут у нас таксама ёсць сур'ёзныя зрухі наперад. Тавараабарот расце з кожным годам», — сказаў пасол.

Асаблівая ўвага — турыстычнай сферы. Паток падарожнікаў з Беларусі ў Грузію расце. І ў гэтым годзе павышэнне колькасці звыш 40 працэнтаў. Па словах дыпламата, яшчэ раз было адзначана, што паміж Беларуссю і Грузіяй няма закрытых тэм і па ўсіх напрамках ідзе супрацоўніцтва.

У пачатку наступнага года ў Беларусь плануе прыехаць новы міністр замежных спраў Грузіі, а ўжо вясной у Мінску чакаюць прэм'ер-міністра.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### У тэму

У студзені — верасні гэтага года тавараабарот паміж Беларуссю і Грузіяй склаў 62 мільёны долараў ЗША. Экспартавана беларускай прадукцыі на 46,3 мільёна долараў, імпарт склаў звыш 15 мільёнаў долараў. Дадатнае сальда ў знешнім гандлі і паслугамі. За дзевяць месяцаў 2018 года на экспарце паслуг зароблена 13,2 мільёна долараў.

Сярод асноўных экспартных пазіцый — малочная прадукцыя, табачныя вырабы, сельгасмашыны, лекі. Імпартуюцца з Грузіі мінеральныя воды, віно, нафтапрадукты.

# І ДЗЕЦЯМ, І БІЗНЕСУ

## Прэзідэнт узгадніў назначэнне кіраўніком ААТ «Банк развіцця» Андрэя Жышкевіча

**Выпускнік БДУ і аспірантуры навукова-даследчага інстытута эканомікі Мінэканомікі, кандыдат эканамічных навук Андрэй ЖЫШКЕВІЧ з 2005 года займаў пасаду старшыні праўлення ЗАТ «Мінскі транзітны банк». Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што было шмат кандыдатур, аднак Андрэя Жышкевіча рэкамендавалі старшыня праўлення Нацыянальнага банка і міністр фінансаў.**

Пасля ўзгаднення разглядалася адна з найважнейшых функцый Банка развіцця — падтрымка экспарту. Абмяркоўвалася магчымае фінансаванне праектаў у Афрыцы. «Прэзідэнт падкрэсліў, што для Банка развіцця пашырэнне экспарту з'яўляецца адной з важных задач. Яшчэ абмяркоўвалася праграма па падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, якую ажыццяўляе банк. Гэта знаходзіцца ў фокусе ўвагі ўрада», — сказаў Андрэй Жышкевіч.

Адказваючы на пытанне журналістаў аб мерах падтрымкі прадпрымальнікаў, Андрэй Жышкевіч адзначыў: «Мне здаецца, што асноўнае пытанне — павялічваць аб'ём фінансавання, і Банк развіцця гатовы выдзяляць крэдыты праз банкі-партнёры. Мы адчуваем высокую запатрабаванасць гэтага кірунку. Банк цяпер прапануе вельмі шырокую так званую прадуктовую лінейку. Яе можна паляпшаць, выдзяляючы спецыфічныя формы крэдытаў».

Асобны вектар работы Банка развіцця — сацыяльныя праекты. У гэтым напрамку ўстановай ужо рэалізаваны шэраг праграм, напрыклад «Школьны аўтобус». Паводле слоў новага кіраўніка, такім ініцыятывам і далей будзе аддавацца ўвага.

Расказаў Андрэй Жышкевіч і пра новыя планы асваення рынку Афрыкі: «Гэты праект звязаны з арганізацыяй пастаўкі сухога малака ў Кенію. Ідэя была ў тым, каб кенійскім інвестарам даць магчымасць укладваць сродкі ў поўнае беларускае сельскагаспадарчае прадпрыемства. Каб яны самі стваралі гэтую прадукцыю і арганізоўвалі экспарт».

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Улады Францыі пайшлі на саступкі «жоўтым камізэлькам»



Прэм'ер-міністр Францыі Эдуар Філіп абвясціў аб увядзенні паўгадавога мараторыя на рост падаткаў на паліва на фоне пратэстаў, якія ахапілі краіну. «Ніякія падаткі не могуць ставіць пад пагрозу адзінства нацыі. Гвалт павінен спыніцца. Мы з прэзідэнтам рэспублікі [Эмануэлем Макронам] прынялі наступнае рашэнне. Тры падатковыя меры, якія павінны былі ўвайсці ў сілу з 1 студзеня... Пасля правядзення кансультацый тэрмінам на шэсць месяцаў я замарожваю гэтыя падатковыя меры, якія не будуць прыняты без абмеркавання з усімі бакамі», — заявіў кіраўнік урада, выступаючы са зваротам да народа ў эфіры французскіх тэлеканалаў. У лік мер, на якія накладзены мараторый, трапілі, у прыватнасці, рост цэн на паліва, супастаўленне падаткаў на бензін і на дызельнае паліва. Менавіта змена падатку на паліва з 1 студзеня 2019 года і справакавала хвалю маштабных пратэстаў «жоўтых камізэлек», якая ахапіла ўсю краіну. Прадстаўнікі апазіцыі заяўлялі, што, калі ўлада не пойдзе на саступкі, краіну можа чакаць магутны сацыяльны выбух: выступ «жоўтых камізэлек» ужо параўноўвалі з Жакерыяй — найбуйнейшым у гісторыі краіны сялянскім паўстаннем.

## Прэм'ер Іспаніі лічыць неабходным адмяніць недатыкальнасць караля

Рэформа Канстытуцыі Іспаніі павінна ўключаць скасаванне недатыкальнасці караля, заявіў прэм'ер краіны Педра Санчэс.



Кіраўнік урада, адказваючы на пытанне журналістаў, ці састарэла Канстытуцыя ў частцы недатыкальнасці караля, сказаў «без сумнення», а на пытанне, ці выключыў бы ён гэты прывілей з асноўнага закона, дадаў: «Упэўнены, што кіраўнік дзяржавы таксама». Згодна з 56-м артыкулам Канстытуцыі «асоба караля недатыкальная і ён не падлягае адказнасці». Пры гэтым Санчэс прызнаў, што цяпер глыбокае рэфармаванне Канстытуцыі немагчымае, аднак могуць быць унесены кропкавыя змены. «Я не імкнуся вырашыць усе праблемы нашага пакалення. Вырашым некаторыя, а наступныя пакаленні няхай вырашаць свае», — сказаў прэм'ер у інтэрв'ю шэрагу іспанскіх тэлеканалаў, у тым ліку дзяржаўнаму тэлебачанню Іспаніі TVE, якое ён даў у сувязі з 40-годдзем Канстытуцыі, што адзначаецца гэтымі днямі. У якасці прыкладаў пытанняў, па якіх могуць быць унесены змены, ён назваў ахову здароўя, роўнасць палоў, навакольнае асяроддзе, эўтаназію. Раней урад Іспаніі прыняў рашэнне адмяніць судовыя прывілеі для членаў кабінета міністраў, дэпутатаў і сенатараў. Усе неабходныя змены будуць унесены ў Канстытуцыю на працягу года. Гэта трэцяя рэформа асноўнага закона Іспаніі з моманту яго прыняцця ў 1978-м.

## Самым багатым блогерам у свеце стаў сямігадовы хлопчык



Самым высокааплатным YouTube-блогерам у свеце стаў аўтар канала Ryan ToysReview, сямігадовы хлопчык па імені Раян. Ён праславіўся аглядамі дзіцячых цацак. Рэйтынг самых багатых прадстаўнікоў відэахостынгу апублікавала выданне Forbes. У перыяд з 1 чэрвеня 2017 года да пачатку лета 2018-га Раян зарабіў 22 мільёны долараў, паводле разлікаў партнёраў і рэкламадаўцаў. Усяго на канал Ryan ToysReview падпісана 17 мільёнаў чалавек. Другое месца ў рэйтынгу самых высокааплатных блогераў заняў Джэйк Пол. За апошні год ён атрымаў 21,5 мільёна долараў. Карыстальнікі праглядзелі яго ролікі больш за 3,5 мільярда разоў. Самы папулярны блогер у свеце PewDiePie (Фелікс Чэльберг) атрымаў 15,5 мільёна долараў і трапіў на восьмае месца рэйтынгу. Таксама ў спісе Forbes апынуліся такія вядомыя на YouTube асобы, як геймер DanTDM, візажыст Jeffree Star і каментатар відэагульняў Jacksepticeye.

# Соль зямлі

## Бізнесмен Міхаіл Гуцэрыеў паведаміў Прэзідэнту аб ходзе будаўніцтва горнаабагачальнага камбіната

**Расійскі прадпрымальнік Міхаіл Гуцэрыеў — старшыня савета дырэктараў кампаніі «Слаўкалій», якая рэалізуе праект па стварэнні новага прадпрыемства ў Беларусі.**

Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы звярнуў увагу на важнасць прыцягнення айчынных спецыялістаў да будаўніцтва камбіната і падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў.

«Яны прывезлі тэхналогіі — гэта добра. Гэта ўсё застаецца потым тут, у Беларусі. Гэта значыць, мне трэба ўзяць ад цябе добрых спецыялістаў, каб яны засталіся ў Беларусі, і тэхналогіі», — перадае словы Прэзідэнта БелТА.

Будаўніцтву Нежынскага горнаабагачальнага камбіната на базе Старобінскага радовішча калійных соляў (побач з Салігорскам) далі старт у 2015 годзе. План прадугледжвае стварэнне горназдабыўнога комплексу, абагачальнай фабрыкі, газатурбіннай электрастанцыі для ўласных патрэб, чыгуначнай, аўтадарожнай, жыллёвай і іншай інфраструктуры. Нежынскі ГАК стане другім у краіне прадпрыемствам па здабычы калійнай руды і вытворчасці калійных угнаенняў магутнасцю да двух мільёнаў тон хларыду калію ў год.

# У чым шчасце, брат?

## Расіяне лічаць Беларусь самай паспяховай і стабільнай краінай у СНД

**Такой нашу дзяржаву назвалі 68 % рэспандэнтаў. На другім месцы — Казахстан (52 %), на трэцім — Азербайджан (16 %).**

Вынікі апытання «Партнёры Расіі на постсавецкай прасторы» на прэс-канферэнцыі ў Маскве прэзентаваў Усерасійскі цэнтр вывучэння грамадскай думкі.

Акрамя таго, Прэзідэнт Беларусі карыстаецца найбольшым даверам у расіян сярод кіраўнікоў краін СНД. Першае месца Аляксандру Лукашэнку ў рэйтынгу аддалі 65 % апытаных. На другой пазіцыі — казахстанскі лідар Нурсултан Назарбаеў, за яго прагаласавалі 49 % рэспандэнтаў. Далей у рэйтынгу размясціліся кіраўнікі Азербайджана, Арменіі, Малдовы.

На думку рэспандэнтаў, Беларусь першая і ў рэйтынгу дзяржаў, якія імкнуцца развіваць з Расіяй эканамічнае супрацоўніцтва і падтрымліваюць яе на міжнароднай арэне.

Таксама, згодна з вынікамі апытання, думку, што рускамоўныя грамадзяне ў Беларусі адчуваюць сябе найбольш абаронена, падзяляюць 68 % расіян.

Пад паняццем «рускамоўныя» сацыёлагі мелі на ўвазе грамадзян той ці іншай краіны, якія гавораць на рускай мове і не з'яўляюцца прадстаўнікамі тытульнай нацыі.

Апытанне «Партнёры Расіі на постсавецкай прасторы» УЦВГД правodзіў па тэлефоне 8 лістапада. Удзел у ім прынялі 1600 чалавек.

**Паводле БелТА.**

**Сумная вестка: пайшоў з жыцця Мікалай Мікалаевіч ГРУШЭЎСКІ, які шмат гадоў на старонках «Звязды» вёў адмысловую рубрыку «Шашкі».**

**Светлы быў чалавек!**

**Шчырыя спачуванні родным, сябрам, усім, хто любіў і ведаў.**

**Звяздоўцы.**

Дабрачыннасць

# ПАДАРУНАК КОЖНАМУ

### Акцыя «Нашы дзеці» ахопіць больш за 15 тысяч хлопчыкаў і дзяўчатак

**Сёлета ў рэспубліканскай акцыі прымуць удзел 90 устаноў і прадпрыемстваў — гэта і дзяржаўныя арганізацыі, і прыватны бізнес. Павіншаваць дзяцей напярэдадні зімовых свят традыцыйна прыедуць найвышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі міністэрстваў. Наведаць прапануецца каля 120 аб'ектаў — сярод іх школы-інтэрнаты, цэнтры карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі, прытулкі, садкі, бальніцы.**

— Для ўстаноў набываецца неабходнае абсталяванне, рэчы, цацкі — усё, каб дзеці адчувалі сябе ў максімальна камфортных умовах, — адзначае **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алена СІМАКОВА.** — У 2017 годзе падчас акцыі была аказана матэрыяльная дапамога, набыты падарункі на суму больш за 1 мільён 205 тысяч рублёў.

Старт святочным мерапрыемствам будзе дадзены 11 снежня: у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі адкрыецца XXII Рэспубліканская выстаўка-конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Калядная зорка». Свае работы там прадставяць 10 тысяч навучэнцаў з 500 устаноў адукацыі. У гэты ж дзень стартуе заключны этап VII Рэспубліканскага агляду-конкурсу Дзядоў Марозаў і Снягурак «Ёлка-фэст», дзе за званне найлепшага будуць змагацца 14 педагогаў.

Галоўнай падзеяй стане святочная ёлка з удзелам кіраўніка дзяржавы. Туды ўжо запрошаны дзве тысячы школьнікаў з розных рэгіёнаў. У Палацы Незалежнасці адбудзецца таксама ўрачыстая сустрэча з найлепшымі навучэнцамі і студэнтамі краіны. У рэгіёнах пройдуць навагоднія балы, святы для выхаванцаў шматдзетных і прыёмных сем'яў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

На слыху

# Грашовыя нормы на харчаванне

### ВА ЎСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ ПАВЫСІЛІСЯ

**Пастановай урада ад 30 лістапада № 863 з 1 снежня павялічаны грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне асобных катэгорый навучэнцаў ва ўстановах адукацыі.**

У прыватнасці, на 10 % павялічыліся грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне ва ўстановах дашкольнай адукацыі, цэнтрах карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі для дзяцей з працяглым знаходжаннем (трохразовым і чатырохразовым харчаваннем), у агульнаадукацыйных установах адукацыі, дзе арганізавана трох-, чатырох- і пяціразовае харчаванне (у гімназіях-інтэрнатах, санаторных школах-інтэрнатах для дзяцей ва ўзросце 6—10 гадоў і 11—13 гадоў, спецыяльных агульнаадукацыйных школах-інтэрнатах і дапаможных школах-інтэрнатах для дзяцей ва ўзросце 6—10 гадоў), а таксама на харчаванне ўдзельнікаў адукацыйных мерапрыемстваў з ліку навучэнцаў устаноў адукацыі.

Акрамя таго, на 7—8 % павялічыліся грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне ў школах, гімназіях, ліцэях з працягласцю знаходжання 9—10,5 гадзіны (трохразовае харчаванне) для дзяцей ва ўзросце 6—10 гадоў, у санаторных школах-інтэрнатах (з пяціразовым харчаваннем) для дзяцей ва ўзросце 14—17 гадоў, у спецыяльных агульнаадукацыйных школах-інтэрнатах і дапаможных школах-інтэрнатах (з чатырохразовым харчаваннем) для дзяцей ва ўзросце 11—13 гадоў.

А для навучэнцаў устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, якія атрымліваюць трохразовае харчаванне, грашовыя нормы павялічыліся на 6 %.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Інавацыі ў адукацыі

# Вывучыць фізіку з дапамогай... робата

**Мабільная праграма для вывучэння гісторыі, месенджар для выкладчыкаў і студэнтаў, навучальны курс па фінансавай адукаванасці, камп'ютарная праграма для спартсменаў... Усе гэтыя праекты былі прадстаўлены ў фінале III Рэспубліканскага конкурсу маладзёжных праектаў «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу».**



Сёлета ў аргкамітэт паступіла больш за 120 заявак ад школьнікаў, навучэнцаў прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных устаноў і студэнтаў ВНУ, а ў фінал прабіліся толькі 13 з іх.

Работы канкурсантаў ацэньвала экспертная група, у склад якой увайшлі спецыялісты Міністэрства адукацыі, БДЭУ, кампаній МТС, beCloud і мясцовага сацыяльнага фонду «Добра». Рашэннем журы пераможцамі былі аб'яўлены тры праекты.

Цімафей Стамбройскі са слуцкай сярэдняй школы № 11 перамог са сваёй мабільнай праграмай для вывучэння фізікі пры дапамозе робата RiBFoP. Ён, дарэчы, набраў найбольшую колькасць балаў і стаў абсалютным пераможцам конкурсу.

У лік пераможцаў трапіў і праект навучэнца Сталінскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа Ільі Архіпава — мабільная праграма для хуткага ўспрымання тэксту 4Read. А вучаніца мінскай школы № 218 Селен Караман перамагла са сваёй даследчай анлайн-платформай GeekStarterPRO.

Аўтары найлепшых праектаў атрымалі падарункі ад кампаніі МТС, а абсалютны пераможца — ноўтбук ад галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Мінадукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Напярэдадні падзеі

# Старт для будучых чэмпіёнак

6-7 снежня Мінск прыме традыцыйны турнір па мастацкай гімнастыцы на прызы Марыны Лобач

**Амаль 100 гімнастак з 10 краін паспрачаюцца за ўзнагароды 16-га Міжнароднага турніру па мастацкай гімнастыцы на прызы алімпійскай чэмпіёнкі Марыны Лобач. Турнір праводзіцца ў Мінску з 2002 года і ўжо заняў сваё важнае месца ў міжнародным календары.**

Цяперашні турнір асаблівы: 30 гадоў таму Марына Лобач, заваяваўшы «золата» Сеула, стала першай савецкай алімпійскай чэмпіёнкай па мастацкай гімнастыцы. Сёлета ў Палацы мастацкай гімнастыкі гледачы ўбачаць спартсменак з Расіі, Украіны, Італіі, Ізраіля, Літвы, Эстоніі, Кіпра, Польшчы, Казахстана, традыцыйна моцным будзе склад і беларускай каманды. Узнагароды будуць разыграны ў трох узроставых катэгорыях, галоўным прызам, за перамогу ў мнагабор'і старшай групы, стане імянная статуэтка Марыны Лобач, найлепшых таксама ўзнагародзяць спецыяльнымі прызамі, якія падрыхтаваў адзін з галоўных арганізатараў спаборніцтваў, Прэзідэнцкі спартыўны клуб.

Сярод перспектыўных гімнастак гледачы ўбачаць беларуску Ганну Каменшчыкаву. Сёлета яна перамагала на турніры «Хрустальная ружа», які папярэднічае дамашняму этапу Кубка свету. На чэмпіянаце Еўропы ў Гвадалахары спартсменка заваявала «серабро» ў кампазіцыі з булавамі.

Адзначым, што турнір Марыны Лобач ужо традыцыйна стаў добрым стартам для будучых зорак мастацкай гімнастыкі. У будучыні яго ўдзельніцы будуць вызначацца на чэмпіянатах свету і Алімпійскіх гульнях.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# «Свет кніг» на Арэне

**Кніжны кірмаш «Свет кніг», вядомы многім сталічным кнігалюбам, змяніў месца сваёй «прапіскі». Калі раней ён знаходзіўся ў выставачным павільёне «БелЭкспа», то пасля таго як будынак быў знесены, давялося шукаць новае месца для гандлю. Такім чынам, цяпер кніжны кірмаш «Свет кніг» можна знайсці на трэцім паверсе гандлёвага цэнтра «Арэна-сіці», што на праспекце Пераможцаў.**

Кніжны кірмаш крыху змяніў сваё аблічча. Цяпер гэта не так званыя «кніжныя развалы», а асобныя гандлёвыя пункты. Гэта 16 павільёнаў, якія працуюць з 10 да 22 гадзін, і 8 павільёнаў з рэжымам працы з 11 да 19 гадзін.

Як расказаў **старшыня Рады прадпрымальнікаў кніжнага кірмашу «Свет кніг» Ігар ФЕЙГІН,** варта завітаць да іх на кірмаш не толькі дзеля самых кніг, але і дзеля кантактавання з гандлярамі. Яны абавязкова раскажуць, што лепш набыць, параяць, ды ўвогуле не сустрэць пагутарыць на якую-небудзь калякніжную тэму. Асаблівая чытацкая атмасфера — вось што таксама важна, мяркуе Фейгін.

Увогуле ж гэты гандаль кнігамі зараджаўся яшчэ ў 1980-я гады, на фоне кніжнага дэфіцыту, які быў у Савецкім Саюзе. Тады пачалі арганізоўвацца гурткі кнігалюбаў, а таксама кніжныя кірмашы. У самым пачатку мінскія аматары чытання збіраліся на беразе ракі Пціч, затым у розных гарадскіх палацах культуры. Традыцыя шанавання кніг не перарываецца вось ужо чацвёрты дзясятак гадоў.

У сваю чаргу **старшыня Рады арганізатараў кніжных выставак і кірмашоў краін — удзельніц СНД, генеральны дырэктар «Макбел» Дзмітрый МАКАРАЎ** даў параду чытачам: калі ўзнікае жаданне набыць кнігу ў інтэрнэце, не спяшацца рабіць гэта. Варта паглядзець, колькі яна каштуе, напрыклад, у суседняй кнігарні. Справа ў тым, што інтэрнэт-распаўсюджвальнікі часцей за ўсё не працуюць напрамую з выдавецтвамі, таму іх цэны значна вышэйшыя. Так, Дзмітрый Макараў пацікавіўся цэнамі на сайтах і параўнаў іх з тымі, якія выстаўляюць у «Свеце кніг». Вынік аказаўся ну вельмі нечаканы. «Беларусь замкавая» напрыклад, якая заваявала шмат узнагарод на кніжных конкурсах, на сайтах каштуе каля 109 рублёў, у «Свеце кніг» — 49 рублёў.

Варта дадаць, што «Свет кніг» гандлюе, у асноўным, кнігамі расійскіх выдавецтваў. Але час ад часу яны супрацоўнічаюць і з беларускімі выдаўцамі.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Сугучча

# МУСТАЙ КАРЫМ — ДРУЖБА НА СТАГОДДЗІ

**У мінскім выдавецтве «Мастацкая літаратура» рыхтуецца да друку кніга, прысвечаная класіку башкірскай літаратуры Мустаю КАРЫМУ.**

Пад адной вокладкай выдання, ідэю якога падтрымалі ў Пастаянным камітэце Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, будуць змешчаны творы башкірскага паэта і празаіка, а таксама артыкулы, прысвечаныя Мустаю Карыму. Да ўдзелу ў адмысловым зборніку спрычыніліся і пісьменнікі з рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі: вядомы балкарскі паэт і перакладчык, ганаровы старшыня Клуба пісьменнікаў Каўказа Саліх Гуртуеў, башкірская паэтэса Зульфія Хананава, чувашскі перакладчык Валеры Тургай. Пра тое, як узнікла сама ідэя выдання, чаму выбар прыпаў менавіта на Мустая Карыма, расказвае **дырэктар выдавецтва пісьменнік Алесь БАДАК:**

— Па-першае, наступны год юбілейны для класіка башкірскай літаратуры: нарадзіўся Мустай Карым у 1919-м... Па-другое, імя паэта добра вядомае і ў Беларусі. Яго вершы ў ранейшыя дзесяцігоддзі пераклалі на беларускую мову Іван Калеснік, Сцяпан Гаўрусёў, Валянцін Лукша. З Карымам добра сябравалі і беларускія паэты-класікі. Мы, дарэчы, акрамя кнігі, пра якую ідзе гаворка, збіраемся выдаць яшчэ і вершаваны зборнік башкірскага майстра вершаскладання ў перакладзе на беларускую мову. Ёсць у нашым выдавецтве такая серыя — «Сябрына: паэзія народаў Расіі». Ужо пабачылі ў ёй свет кнігі ўдмурта Вячасла Ар-Сяргі і татарына Роберта Мінуліна. Дзякуючы руплівасці беларускіх перакладчыкаў, спадзяюся, у хуткім часе серыя папоўніцца і кнігай вершаў Мустая Карыма.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Тры пытанні да ўлады

# АКТЫЎНА БУДУЕЦЦА ЖЫЛЛЁ І РАЗВІВАЕЦЦА ВЫТВОРЧАСЦЬ

Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў старшыні Лёзненскага райвыканкама Івана Лаўрыновіча, якія навіны ў раёне, што мяжуе з Расіяй

***— Нядаўна ў раёне адсвяткавалі 75-ю гадавіну вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адкрылі пасля рэканструкцыі мемарыял у райцэнтры. Калі ласка, нагадайце пра гэту падзею.***

— 10 кастрычніка мы першымі ў вобласці адсвяткавалі 75-ю гадавіну вызвалення. Памятнай і сумнай вяхой увайшлі ў гісторыю раёна гады Вялікай Айчыннай. За час акупацыі было спалена 196 вёсак, разрабаваныя ўсе прадпрыемствы, калгасы і саўгасы, цалкам разбураны гарадскі пасёлак. Самымі цяжкімі былі людскія страты. Калі да вайны ў раёне пражывала каля 60 тысяч чалавек, то пасля вызвалення раёна — амаль 15,5 тысячы.



Доўгія дзевяць месяцаў кровапралітных баёў за Лёзненшчыну былі аплачаны коштам жыццяў больш як 32 тысяч воінаў Чырвонай Арміі і партызан. І сведчанне таму — 88 воінскіх пахаванняў, больш за 600 помнікаў і абеліскаў, устаноўленых на месцах баявой славы і гібелі воінаў-вызваліцеляў, мірных жыхароў.

У час святкавання юбілею адбыліся два значныя мерапрыемствы. І ў першую чаргу гэта адкрыццё пасля маштабнай рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Адаменская горка». Мемарыял пабудавалі ў 1984-м. Тут спачываюць байцы Чырвонай Арміі, якія загінулі падчас вызвалення ў 1943—1944 гадах, а таксама памерлыя ад ран пацыенты ваенных шпіталяў, якія размяшчаліся ў ваколіцах. За вельмі кароткі тэрмін, дзякуючы спонсарскай дапамозе жыхаркі Масквы Марыны Фраловай, сваячкі малодшага лейтэнанта Мікалая Лашкова, які загінуў пры вызваленні і пахаваны тут, удалося зрабіць рэканструкцыю. А менавіта — правесці падрыхтоўчыя работы і ўсталяваць стэлы з ордэнам Айчыннай вайны, паміж якімі знаходзяцца мемарыяльныя пліты з прозвішчамі загінулых. Раней іх было вядома толькі 500. Да 75-гадавіны вызвалення была праведзена сур'ёзная пошукавая работа і ўстаноўлена яшчэ 320 імёнаў загінулых вызваліцеляў.

Са свайго боку мы аказалі ўсю неабходную дапамогу. Былі праведзены суботнікі па добраўпарадкаванні тэрыторыі.

***— Калі не памыляюся, у гонар юбілею вызвалення ў райцэнтры быў здадзены фізкультурна-аздараўленчы комплекс?***

— Так. Яшчэ адзін знакавы момант святкавання — гэта адкрыццё другой чаргі фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Да гэтага ў 2016 годзе былі адкрыты ў адным будынку бібліятэка, Дом рамёстваў і некалькі спартыўных памяшканняў.

А да 75-годдзя вызвалення пачалі працаваць басейн з трыма дарожкамі, трэнажорная і гульнявая залы. Пра тое, што Лёзну патрэбны басейн, тутэйшыя казалі даўно. Ды многія нават не марылі, што калі-небудзь гэта стане явай. Але прынялі рашэнне — басейну быць! Ідэю падтрымалі і старшыня аблвыканкама Мікалай Шарснёў, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір Андрэйчанка. Сёння няпроста знаходзіць грошы на стварэнне такіх аб'ектаў, але мы гэта робім. Таму што і ў маленькіх рэгіёнах людзі розных узростаў павінны мець магчымасць займацца фізічнай культурай і клапаціцца пра здароўе.

***— У раёне актыўна будуецца жыллё і развіваецца вытворчасць. Скажыце некалькі слоў пра гэтыя кірункі.***

— У раёне праводзіцца эфектыўная і планавая жыллёвая палітыка. Практычна штогод будуюцца шматкватэрныя жылыя дамы ў гарадскім пасёлку. На 2018-ы раёну было даведзена заданне па ўводзе жылля агульнай плошчай 3700 квадратных метраў. Для выканання гэтага задання ў эксплуатацыю ўводзяцца адразу два дамы: 8-кватэрны па вуліцы Дабрамыслінскай і 40-кватэрны жылы дом — на Лыньковa. Плюс — індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва (агульнай плошчай 1245 «квадратаў»).

Дарэчы, 8-кватэрны дом — гэта эксперыментальны будынак у нашым рэгіёне з выкарыстаннем электрычнай энергіі для ацяплення, гарачага водазабеспячэння і прыгатавання ежы. У двухпакаёвыя кватэры заселяцца спецыялісты, якія маюць патрэбу ў жыллі.

На 2019 год запланавана будаўніцтва 40-кватэрнага жылога дома па вуліцы Марыі Акцябрскай і індывідуальных жылых дамоў — агульнай плошчай тысяча квадратных метраў.

Накont вытворчасці. Будзе весціся будаўніцтва свінагадоўчага рэпрадуктара (на 5000 галоў свінаматак у год) паблізу аграгарадка Пушкі. Фінансуе гэты праект Міжнародны банк развіцця сумесна з беларуска-ізраільскай фірмай AGRIGO Projects ltd. Адкрыццё запланавана на 2020 год.

А налета плануецца завяршэнне будаўніцтва цэха племяннога маладняку ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка» — недалёка ад населенага пункта Перамонт.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Міншчына дзівосная

# ВІЛЕЙСКІ СТОНХЕНДЖ

**Не адну таямніцу захоўвае дзівосны Вілейскі край. Унікальнасць яму надаюць загадкавыя культавыя камяні з рукатворнымі паглыбленнямі. На сённяшні дзень на тэрыторыі раёна іх налічваецца каля дваццаці.**



Старадаўнімі легендамі авеяны і валуны, што раскідаў па вёсках апошні ледавік. На працягу некалькіх тысячагоддзяў захоўваўся на Вілейшчыне незвычайны каменны ідал часоў язычніцтва — двухметровая фігура жаночага бажаства з распасцёртымі рукамі і выявай дзіцяці. На адваротным баку высечаны старажытныя знакі. На думку даследчыкаў, гэта — вобраз старадаўняй багіні — прамаці, або багіні Мары. Сёння прадмет пакланення выстаўлены ў будынку Інстытута геалогіі Нацыянальнай акадэміі навук.

Здзіўляе і самы вялікі валун раёна — вага яго часткі, што ўзвышаецца на паверхні, каля 90 тон. Па легендзе, гэта — ператвораны за вялікі грэх у камень разам са сваім домам шавец, які працаваў на свята Вялікдзень, калі ўсе маліліся ў храме. Захаваўся тут і ўнікальны Барысаў камень, што служыў пагранічным знакам у XII стагоддзі на землях князя Барыса, яго яшчэ называюць «Варацішын крыж» — з-за нанесенага на яго надпісу і высечанага крыжа. Але, бадай, самай інтрыгуючай з'яўляецца загадка комплексу камянёў каля вёскі Сцеберакі. Многія вучоныя сыходзяцца ў меркаванні, што гэта — старажытная абсерваторыя, якая была створана нашымі продкамі каля 7,5 тысячы гадоў таму. Інакш кажучы, беларускі Стонхендж. Комплекс уяўляе сабой пяць вертыкальна пастаўленых камянёў з выявай разнастайных сімвалаў і рог-рытонаў. У народзе іх называюць — «Каменныя быкі». Паводле легенды, быкі акамянелі, калі нейкі селянін араў поле ў свята. Камяні ў Сцебераках арыентавалі на поўнач, на Палярную зорку, а супрацьлеглы паўднёвы напрамак старажытныя людзі выкарыстоўвалі для вызначэння часу першай і апошняй квадры месяца. Некаторыя даследчыкі лічаць, што нават пры-няўшы хрысціянства, яны працягвалі пакланяцца камяням. Таму князь загадаў выбіць на іх крыжы. На думку іншых, гэтыя знакі з'явіліся ў галодныя 1127—1128 гады.

У нашай краіне захаваліся толькі чатыры Барысавы камяні. Адзін з іх быў вывезены ў Расію ў музей-запаведнік «Каломенскае». У Беларусі засталіся тры старажытныя сімвалы, у тым ліку ў пасёлку Друя, каля храма Святой Сафіі ў Полацку, што на Віцебшчыне, і ў вёсцы Камена на Вілейшчыне.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Сталіца

# ЗАРЭГІСТРАВАЎСЯ І КАРТКУ ГОСЦЯ НАБЫЎ

**У снежні Мінскае гарадское агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры пачало рэалізацыю камплекта «Картка Госця».**

Набыццё гэтага камплекта дазволіць усім аматарам падарожжаў і людзям, якія цікавяцца гісторыяй нашай краіны, атрымаць унікальную магчымасць аптымальна спланаваць маршруты азнаямлення з выдатнымі мясцінамі сталіцы і яе навакольляў з максімальнай выгадай для свайго бюджэту.

Набываючы камплект «Картка Госця», яе ўладальнік атрымлівае пластыкавую смарт-картку і даведнік. Гэтая картка дае права аднаразовага наведвання (бясплатна або са зніжкай) музеяў і экскурсій, мастацкіх галерэй, уключаных у праграму, а таксама заапарка, аквапарку і назіральнай пляцоўкі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Картка дзейнічае з моманту актывацыі пры наведванні першага аб'екта на працягу 24, 48, 72, 120, 168, 240 гадзін або 12 месяцаў, у залежнасці ад фармату карткі. Тэрмін дзеяння паказаны на картцы.

Турыстычны камплект таксама дае права атрымання зніжак да 20 % у гатэлях, рэстаранах, кафэ, крамах і пры афармленні напракат аўтамабіляў згодна з пералікам партнёраў, паказаным у даведніку. Зніжкамі ў аб'ектах гэтага тыпу можна скарыстацца на працягу трох гадоў пасля набыцця карткі незалежна ад часу актывацыі карткі пры наведванні аб'ектаў першага тыпу. Набыць камплект «Картка Госця» можна ў касе агенцтва па адрасе: Мінск, вул. Максіма Багдановіча, 153, зала прыёму.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Супрацоўніцтва

# ПРАВА НА ПАЎНАВАРТАСНАЕ ЖЫЦЦЁ

**У Мінску праводзіцца Міжнародная канферэнцыя па пытаннях безграмадзянства ў дзяржавах — удзельніцах СНД.**

Канвенцыя 1954 года вызначае асобу без грамадзянства (апатрыда) як таго, «хто не прызнаецца грамадзянінам якой-небудзь з дзяржаў у адпаведнасці з яе заканадаўствам».

Можна ўявіць сабе, якое жыццё ў тых, хто не мае грамадзянства. Без яго чалавек не можа прагаласаваць, атрымаць праязны дакумент, уступіць у шлюб. Часта асобам, якія не здолелі даказаць сваю сувязь з краінай пражывання, адмаўляюць нават у асноўных правах чалавека — праве на адукацыю, ахову здароўя і працаўладкаванне.

Па словах **намесніка міністра ўнутраных спраў Мікалая МЕЛЬЧАНКІ**, у нашай краіне каля 1100 замежных грамадзян звярнулася сёлета з просьбай аб атрыманні беларускага грамадзянства. З іх 250 — асобы без грамадзянства. У асноўным гэта прадстаўнікі краін СНД.

— Апошнім часам на фоне ваенных канфліктаў прыток мігрантаў у краіны Заходняй Еўропы павялічыўся. Але для Беларусі такая з'ява як безграмадзянства сур'ёзнай праблемай не з'яўляецца. Напрыклад, у 2000 годзе асоб без грамадзянства ў нас было каля 20 тысяч, а зараз — крыху больш за шэсць тысяч, — сказаў Мікалай Мельчанка. — Гэтую канферэнцыю мы арганізавалі для таго, каб абмяняцца вопытам з прадстаўнікамі іншых краін, даведацца, як яны пераадольваюць праблему патоку людзей без грамадзянства. Акрамя таго, для нас пытанні безграмадзянства, міграцыі звязаны перш за ўсё з бяспекай, і мы павінны гарантаваць гэтую бяспеку цывілізаваным чынам. Асобна трэба заўважыць: нягледзячы на тое, што Рэспубліка Беларусь не далучаная да двух канвенцый ААН па безграмадзянстве 1954 і 1961 гадоў, у нашым заканадаўстве прапісаны парадак работы з асобамі згаданай катэгорыі. Мы не стаім тут на месцы. Так, у 2015 годзе былі прынятыя змены ў заканадаўстве, з якіх вынікае, што дзіця, якое нарадзілася ў Беларусі, можа стаць яе грамадзянінам, нават калі адзін або абое бацькоў не з'яўляюцца грамадзянамі нашай краіны.

Са свайго боку, **Жан-Іў БУШАРДЗІ, прадстаўнік Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Рэспубліцы Беларусь,** паведаміў:

— У 2014 годзе пачалася 10-гадовая кампанія па ліквідацыі безграмадзянства ў свеце. Амаль палова тэрміну яе рэалізацыі ўжо скончана. Канферэнцыя, якая праходзіць у Мінску, вельмі важная і своечасовая. У рамках гэтага мерапрыемства мы будзем абмяркоўваць, якім чынам вырашаць пытанні безграмадзянства, перш за ўсё, дзякуючы абмену вопытам паміж краінамі. Што датычыцца Беларусі, сітуацыя ў ёй стабільная. Па звестках статыстыкі, колькасць тых, хто не мае грамадзянства, памяншаецца. Напрыклад, на працягу мінулага года каля 500 асоб набылі грамадзянства Беларусі.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# Паспець за «лічбай»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Змяніць свядомасць

— Мы жывём у час сур'ёзных перамен і велізарнага адукацыйнага патэнцыялу. Нашы дзеці, народжаныя ў лічбавым свеце, ужо не вучацца, як выкарыстоўваць тэхналогіі, а прымяняюць іх для таго, каб вучыцца, — падкрэслівае **кіраўнік прадстаўніцтва кампаніі «Майкрасофт» у Беларусі Антон МЯКІШАЎ.** — Разумеючы, што свет вакол нас змяняецца, студэнты і школьнікі змяніліся, мы таксама павінны змяніць і сістэму адукацыі. Трэба вучыць дзяцей тым уменням, якія будуць запатрабаваныя заўтра, а не сёння ці ўчора.

Вучні і студэнты чакаюць больш персаналізаванага падыходу ў навучанні, яны хочуць вывучаць толькі той матэрыял, што ім цікавы, з тых прылад, з якіх ім гэта зручна рабіць, з таго месца, дзе яны зараз знаходзяцца, і з той хуткасцю, якая камфортная менавіта для іх. Школьнікі хочуць узаемадзейнічаць з настаўнікамі і аднакласнікамі не проста ў фармаце класных заняткаў і дамашняй работы, а ў межах лічбавай прасторы, якая забяспечыць ім магчымасць сумеснай работы над задачамі і праектамі. Смартфоны, планшэты, відэалекцыі — усё гэта вучні хацелі б выкарыстоўваць. І калі ў іх з'яўляецца такая магчымасць, гэта вельмі павышае іх матывацыю і цікавасць да навучання.

На жаль, але даводзіцца канстатаваць, што сістэма беларускай адукацыі не паспявае змяняцца разам з сучасным светам. Нават калі мы абсталюем вучэбныя аўдыторыі суперсучаснай камп'ютарнай тэхнікай, інтэрактыўнымі дошкамі, забяспечым высакахуткасныя каналы сувязі, але пры гэтым не зменім навучальны працэс, і настаўнік, як і раней, стоячы спінай да класа, будзе штосьці пісаць на гэтай інтэрактыўнай дошцы, а вучні перапісваць у сшыткі, усе нашы намаганні можна лічыць марнымі. Імкненне напоўніць класы матэрыяльнымі доказамі лічбавай трансфармацыі можа быць контрпрадукцыйным, калі не зменіцца свядомасць.

Попыт на вышэйшую адукацыю ў беларускім грамадстве апошнім часам вельмі высокі і ВНУ знаходзяцца ў добрай сітуацыі. Але калі 10—15 гадоў назад анлайнформы дыстанцыйнага навучання толькі рабілі першыя крокі, а гранды — паспяховыя ўніверсітэты — пасмейваліся з падобных спроб (маўляў, у нас жа працуюць масцітыя прафесары і ўвогуле ніякія віртуальныя лекцыі ніколі не заменяць асабістыя стасункі з выкладчыкамі), то сёння мы бачым доказы адваротнага. Такія адукацыйныя анлайн-платформы, як lynda.com і coursera, маюць аўдыторыю ў дзясяткі мільёнаў чалавек, якія такім чынам павышаюць сваю кваліфікацыю і знаходзяць сваё месца на рынку працы.

Напрыклад, у Сан-Францыска з'явілася навучальная ўстанова Minerva Schools at KGT. У яе няма такой сур'ёзнай базы і досведу, як у Кембрыджскага ці Ельскага ўніверсітэтаў, але яе заснавальнікі кажуць, што адсутнасць гэтай спадчыны дазваляе ім стварыць ідэальны ўніверсітэт. Усе праекты ў сферы масавай анлайн-адукацыі ўсур'ёз канкуруюць з вельмі паважанымі і вядомымі ва ўсім свеце ўніверсітэтамі. Гэта таксама пагроза і для беларускіх ВНУ, бо калі яны не будуць змяняцца, то могуць застацца за бортам прагрэсу.

Як жа можа выглядаць лічбавая трансфармацыя на практыцы? Па словах Антона Мякішава, гэта класы, якія натхняюць на вучобу, адукацыя без абмежаванняў па месцы і часе, навучэнцы, захопленыя адукацыйным працэсам, персаналізаванае навучанне, падрыхтаваныя і паспяховыя педагогі, эфектыўная сістэма выкладання, якая дае вынік.




Антон МЯКІШАЎ: «Дзеці, народжаныя ў лічбавым свеце, ужо не вучацца, як выкарыстоўваць тэхналогіі, а прымяняюць іх для таго, каб вучыцца».

## Нявыкарыстаныя магчымасці

**Намеснік галоўнага дырэктара па камерцыйных пытаннях РУП «Белтэлекам» Сяргей ТУРОМША** не толькі расказаў пра ролю нацыянальнага аператара электрасувязі ў лічбавізацыі сістэмы адукацыі, але і падзяліўся сваімі сумненнямі.

— Першапачаткова мы бачылі сваю задачу ў тым, каб забяспечыць фіксаваны доступ у інтэрнэт для ўсіх школ. Яе мы вырашылі яшчэ да 1 верасня 2014 года. У тыя часы пра оптавалакно размова яшчэ не вялася, мы казалі пра доступ у інтэрнэт па медных лініях. Хуткасць ад 2 да 4 мегабіт за секунду была дастатковая нават для патрабавальнага карыстальніка, — кажа ён. — Але тэхналогіі на месцы не стаяць, і паўстала новая задача — забяспечыць установы адукацыі доступам у інтэрнэт ужо па оптавалаконных лініях. На 1 верасня 2018 года ўсе гарадскія сярэднія школы ў краіне ўжо атрымалі доступ у інтэрнэт па оптавалакне: на гэта пайшлі 2,5 мільёна рублёў і прыкладна тры гады нашай працы.

Узнікае заканамернае пытанне, а што далей? Калі мы забяспечылі гарадскія школы, дык забяспечвайце і сельскія. Задача пасільная і рэальная, але давайце разбяромся, для чаго ўвогуле трэба гэта рабіць? Толькі для высакахуткаснага інтэрнэту? Тэарэтычна, пракладваючы оптавалаконную сетку, мы мелі на ўвазе, што школы актыўна пачнуць укараняць у сістэму адукацыі прагрэсіўныя тэхналогіі, якія дазволілі б задзейнічаць оптавалакно. А што назіраем у рэчаіснасці? Спецыяльна прааналізавалі, што з паслуг оптавалакна выкарыстоўваюць нашы школы. Сярэдняя хуткасць доступу ў інтэрнэт складае ўсяго 10 мегабіт за секунду. Шчыра кажучы, нам не трэба было пракладваць оптавалакно, каб забяспечыць такую хуткасць, таму што ёсць пэўныя тэхналогіі, якія і на медных лініях дазваляюць «выціснуць» гэтыя 10 мегабіт.




Сяргей ТУРОМША: «Любы дырэктар школы можа прыйсці ў «Белтэлекам» і агучыць ідэі, якія ён хацеў бы ўвасобіць».

Калі мы кажам, што 96 % гарадскіх школ падключаны да шырокапалоснага інтэрнэту, не трэба сябе падманваць: у многіх з іх выкарыстанне магчымасцяў інтэрнэту абмяжоўваецца толькі кабінетам інфарматыкі і адміністрацыяй установы.

«Мы ўсе бачылі праспект Незалежнасці ў сталіцы на паштоўках 50—60-х гадоў. Яго праезная частка ў тыя часы фактычна пуставала. Толькі рэдкі аўтамабіль ці тралейбус можна было пабачыць на дарозе. Сёння ж пры той жа шырыні праезнай часткі на праспекце назіраецца сапраўдны аншлаг, а ў час пік і дарожныя заторы. Наша оптавалакно задзейнічана навучальнымі ўстановамі прыкладна гэтаксама, як і праезная частка праспекта ў 50—60-я гады XX стагоддзя», — падкрэслівае намеснік генеральнага дырэктара «Белтэлекама».

**«У адукацыйны працэс павінны ўкараняцца штучны інтэлект і нейронныя сеткі, віртуалізацыя адукацыйнага працэсу (дапоўненая рэальнасць) і блокчэйн».**

Сяргей Туромша расказаў пра паслугі, якія аказваюцца на падставе оптавалаконных сетак. Адна з іх — гэта відэа-канферэнцсувязь для правядзення нарад і семінараў для настаўнікаў і выкладчыкаў. Навошта марнаваць час работнікаў, выплачваць ім камандзіровачныя, расходаваць бензін? Другая паслуга VPN — аб'яднанне карпаратыўных сетак па IT-пратаколе, арганізацыя паміж структурамі дакументаабароту і абмену данымі.

— Лагічна, што, калі ў школе ці ўніверсітэце ёсць оптавалакно, там можна раскінуць брэндзіраваную сетку Wi-Fi з доступам як для персаналу, так і для студэнтаў і школьнікаў, — разважае Сяргей Туромша. — Але пакуль што толькі 130 устаноў адукацыі падключаны да гэтай паслугі, з іх 67 школ. Вельмі карысная можа быць і СМС-рассылка праз спецыялізаваны партал: можна аператыўна паведамляць адразу ўсім зацікаўленым пра важныя мерапрыемствы і падзеі з жыцця ўстановы адукацыі, канкрэтнага класа ці педкалектыву. Не да канца выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе і магчымасці інтэрактыўнай платформы ZALA. Усе ведаюць пераважна пра тэлебачанне, але на платформе ZALA ёсць вельмі карысны сэрвіс — відэа па запыце. Там могуць размяшчацца розныя матэрыялы. Дык чаму б не размяшчаць прыклады рашэння задач, тлумачэнні складаных тэм па фізіцы, хіміі, біялогіі? Навошта вучняў адпраўляць на сайты з гатовымі рашэннямі задач? Лепш прапанаваць карысны кантэнт. Пакуль што сур'ёзна казаць, што інтэрнэт дапамагае вучэбнаму працэсу, не выпадае.

«Нам бы вельмі хацелася, каб не мы прыходзілі ў навучальныя ўстановы ў якасці агітатараў, а сістэма адукацыі сфармулявала, якія сэрвісы сёння неабходныя для арганізацыі якаснага адукацыйнага працэсу на ўсіх узроўнях: для агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. Любы дырэктар школы можа прыйсці ў «Белтэлекам» і агучыць ідэі, якія ён хацеў бы ўвасобіць», — запэўнівае Сяргей Туромша.

## Хто будзе першы?

Сёння на парадку дня стаіць стварэнне Рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя. Навучальныя ўстановы аб'ядноўць у адзіную інфармацыйную сістэму з элементамі статыстычнага аналізу.

— Пад інфарматызацыяй мы маем на ўвазе развіццё інфраструктуры, а лічбавая трансфармацыя — гэта свядомая замена любых працэсаў праграмным кодам. Калі можна штосьці замяніць кодам, значыць, трэба гэта зрабіць. А калі нешта немагчыма запраграмаваць, можа быць, самы час ад гэтага пазбавіцца? — разважае **дырэктар галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Павел ЛІС.** — Трэба задаць сабе пытанне: што трэба адкінуць, каб з дапамогай лічбавых тэхналогій імкліва рушыць наперад?

Між іншым, пытанне хуткасці — адно з самых надзённых.

— Калі мы не зменім хуткасць прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў, то нам застанецца толькі пераймаць чужое, бо мы проста не будзем паспяваць ствараць сваё, — папярэджвае Павел Ліс. — Новыя тэхналогіі развіваюцца імкліва, а мы тармозім іх сваімі рашэннямі, асцярожнасцю, нежаданнем браць адказнасць, у нас гады ідуць на апрабацыю і экспертызы. Напрыклад, з'явілася новая тэхналогія, мы прыходзім з ёй у аддзел ці ўпраўленне адукацыі і кажам: трэба яе ўкараняць... І чуем у адказ: «Трэба падумаць, пратэсціраваць, грошай няма, ды і... адказнасць». Прапануем яе раздзяліць, узяўшы на сябе экспертныя функцыі, каб педагагічная грамадскасць магла карыстацца толькі праверанымі сэрвісамі. Я лічу, што чалавек, які не хоча браць на сябе адказнасць, нясе яшчэ большую адказнасць за стрымліванне тэхналогій. Зразумейце, нельга змяніць сваё паўсядзённае жыццё, дзе лічбавыя тэхналогіі даўно прыжыліся, і не змяніць прафесійнае. Трэба выходзіць з зоны камфорту.

Для эфектыўнай трансфармацыі ў адукацыйны працэс павінны ўкараняцца штучны інтэлект і нейронныя сеткі, віртуалізацыя адукацыйнага працэсу (дапоўненая рэальнасць) і блокчэйн. Хуткія рашэнні і ўменне браць адказнасць — асноўны рухавік лічбавай трансфармацыі. Мы будзем або першыя, або ўжо не мае значэння, якія мы будзем..

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Ликвидационная комиссия РУПП «Гроднотекстиль» объявляет о проведении повторного аукциона по продаже имущества

| № п/п | Наименование имущества | Стоимость с НДС | Сумма задатка 10 % |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Водопроводная сеть, 22,24 м, инвентарный № 400/С-72656 (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 594,00 | 59,40 |
| | Канализационная сеть, 129,1 м, инвентарный № 400/С-72659 (сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 1732,98 | 173,30 |
| Лот № 2 | Кабельная линия 0,4 кВт, 83,5 м, инвентарный № 400/С-72680 (сооружение специализированное энергетики) | 248,92 | 24,89 |

Имущество находится по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Богуцкого, 8. Торги состоятся 14 декабря 2018 года в 10.00 по адресу: г. Гродно, ул. Горького, 121. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

– копия платежного поручения о внесении на счет РУПП «Гроднотекстиль»№ BY32BLBB30120500048503001001, БИК BLBBBY2X в ОАО «Белинвестбанк», г. Гродно, УНП 500048503, суммы задатка по каждому лоту;

– копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица (индивидуального предпринимателя).

Документы должны быть представлены до 15.00 11.12.2018. Победитель аукциона возмещает затраты по организации и проведению аукциона. Телефон для справок (8-152) 43-99-64.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже магазина, принадлежащего ОАО «Старобинский ТБЗ»

**Лот №1.** Торговое помещение магазина ПРС, инв. № 644/D-31486. Площадь – 609,5 кв. м. Адрес: Минская обл., Солигорский р-н, г. п. Старобин, ул. Коржа, д. 9А, пом. 2.

**Начальная цена (с НДС) – 138 383,58 бел. руб. Задаток – 15 000,00 бел. руб. Шаг аукциона – 0,1 %**

**Обременения:** договор аренды от 24.04.2017 № 07-03/3А на срок до 23.04.2022 (площадь, сдаваемая в аренду 572 кв. м)

**Условия аукциона:** 1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот № 1 по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи.
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость услуги Организатора аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 09.01.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Продавец: ОАО «Старобинский ТБЗ», 223730, Минская обл., Старобинский р-н, г. п. Старобин, тел. 8 (0174) 299239.
Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 4, тел. 8 (017) 324-70-57.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Старобинский ТБЗ», проводимом 09.01.2019 г.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений 04.01.2019 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта – Шагбутдинова Людмила Николаевна, тел. 8 (029) 143-11-96

**Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

ОАО «МАПИД» приглашает всех желающих принять участие в торгах (аукционе) по продаже бывшей в эксплуатации техники – автомобиля Renault Koleos. Заявление на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб. 17. Окончание приема заявлений 09.01.2019 г. в 12.30. Более подробная информация об аукционе на сайте www.mapid.by, по телефону 8(017) 397-57-32. Аукцион состоится 09.01.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, каб.17. Наименование предмета торгов (аукциона), начальная цена (с НДС):

Лот № 1 – Автомобиль Renault Koleos (внедорожник), 2014 г. в., цена – 32 564,40 руб. с НДС.

Победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязуется возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, а также затраты на оказание услуг по независимой оценке движимого имущества.

УНП 100008115

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Лот 1: капитальное строение, инв. № 450/С-1784 (назначение – здание обрабатывающей промышленности иного назначения, наименование – цех по производству гофротары), площадью 204,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 3А; капитальное строение, инв. № 450/С-1783 (назначение – здание нежилое, наименование – склад), площадью 29,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 1; капитальное строение, инв. № 450/С-28498 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – газопроводная сеть), протяженностью 34,1 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная; капитальное строение, инв. № 450/С-28500 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 2,7 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная; капитальное строение, инв. № 450/С-28501 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – кабельная линия электропередачи напряжением 10 кВ), протяженностью 114,3 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная; капитальное строение, инв. № 450/С-28499 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 31,7 м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная; котел газовый АОГВК-354-1 (установлен в здании цеха по производству гофротары); система средств охранной сигнализации – приемо-контрольный прибор «АЛАРМ-5» с выходом на пульт центрального наблюдения Слонимского ОДО МВД РБ и объемные извещатели ИНС-110 в помещениях (установлено в здании цеха по производству гофротары)

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425450100001000400 (назначение – земельный участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности), площадью 0,0905, расположенном по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 1

Начальная цена продажи – 21 849,60 руб. (двадцать одна тысяча восемьсот сорок девять рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 2 185 руб. (две тысячи сто восемьдесят пять рублей)

Лот 2: полуавтомат роторно-просекательная машина ВК940*2000 для изготовления гофротары (предназначен для высечки картонного кроя)

Начальная цена продажи – 4 588,80 руб. (четыре тысячи пятьсот восемьдесят восемь рублей восемьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 458 руб. (четыреста пятьдесят восемь рублей)

Лот 3: станок для двухцветной флексопечати С2ФМ (предназначен для нанесения одно-двухцветной флексопечати на многослойный картон, производительность 1500 листов/час)

Начальная цена продажи – 5 068,80 руб. (пять тысяч шестьдесят восемь рублей восемьдесят копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 506 руб. (пятьсот шесть рублей)

Продавец – филиал «Слонимский хлебзавод» ОАО «Гроднохлебпром», 231800, г. Слоним, ул. Чкалова, 6, тел. 8-01562-503-31

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – без условий. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Условия расчетов – по договоренности сторон

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 17 декабря 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.
**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.10.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 11 декабря 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

Организатор аукциона – Наровлянский районный исполнительный комитет.

**Предмет аукциона** – право заключения договора аренды на земельный участок площадью 0,0877 гектара, расположенный по адресу: Гомельская область, Наровлянский район, Наровлянский сельсовет, ул. Центральная.

Имеются ограничения в использовании земельного участка на площади 0,0877 гектара в связи с его расположением на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению (зона с правом на отселение), на природной территории, подлежащей специальной охране (водоохранная зона реки Наровлянка) и на площади 0,0108 гектара в связи с его расположением в охранной зоне объектов инженерной инфраструктуры (электрические сети напряжением до 1000 вольт).

Целевое назначение использования земельного участка – для строительства и обслуживания административного здания (земельный участок для размещения объектов административного назначения). Срок аренды земельного участка – 30 (тридцать) лет.

Обеспечение объекта сетями электроснабжения осуществляется от существующих сетей.

Начальная цена продажи – 241,00 рубль (двести сорок один рубль).

Сумма задатка – 24,10 рубля (двадцать четыре рубля 10 копеек).

Размер шага аукциона составляет 10 % от предыдущей цены, названной аукционистом.

**Условия продажи:**

внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;

возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка;

заключение победителем аукциона с Наровлянским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в установленном порядке государственной регистрации прав на земельный участок;

разработка и утверждение в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту;

освоение земельного участка в срок до шести месяцев после разработки и утверждения проектно-сметной документации;

осуществление строительства на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

1. Аукцион состоится 28 декабря 2018 г. в 10.00 в здании Наровлянского районного исполнительного комитета, каб. 12, по адресу: г. Наровля, ул. Коммунистическая, 3.

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, подписавшие соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона на право заключения договора аренды земельного участка.

Для участия в аукционе необходимо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подать в отдел землеустройства Наровлянского районного исполнительного комитета в установленный в настоящем извещении срок заявление на участие в аукционе с указанием адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона, к которому прилагаются следующие документы: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом Республики Беларусь либо индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица Республики Беларусь либо индивидуального предпринимателя; гражданином Республики Беларусь – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30, последний день приема документов – до 17.30 24 декабря 2018 года по адресу: г. Наровля, ул. Коммунистическая, 3. Заключительная регистрация участников – 28 декабря 2018 г. с 9.00 до 9.45.

4. Сумма задатка перечисляется на р/с BY20AKBB36004240000240000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск БИК AKBBBY2X, назначение платежа – 04002.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

6. Организатор открытого аукциона вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до проведения аукциона.

За дополнительной информацией обращаться в Наровлянский районный исполнительный комитет (отдел землеустройства), контактный телефон в г. Наровля 8 (02355) 2-18-67.

## Антикризисный управляющий ИООО «Сырьевые ресурсы» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении 10.01.2019 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 93А, оф. 404, открытых торгов по продаже:

Дебиторской задолженности ИООО «Сырьевые ресурсы»: ООО «AKORT MUHENDISLIK INSAAT SANAYI VE TICARET LIMITED SIRKETI» (размер задолженности – 616 963,80$) – первоначальная цена 555 267,42$; ИП Рамошка В. Ф. (размер задолженности – 19 057,63 руб.) – первоначальная цена 17 151,87 руб.

Имущества ИООО «Сырьевые ресурсы», первоначальной стоимостью 92 353,86 руб., включая НДС, согласно перечню: основные средства – 25 112,04 руб., включая НДС; Малоценные предметы и инвентарь – 8981,96 руб., включая НДС; Строительные материалы – 3513,37 руб., включая НДС; Прочее имущество – 54 746,49 руб., включая НДС.

С полным списком имущества, включенным в лот, можно ознакомиться, направив заявку в адрес организатора торгов, по адресу: info@capital-dialog.by.

Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 09.01.2019 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 09.01.2019 г. вкл. на р/с ИООО «Сырьевые ресурсы» р/с BY91BPSB30120121400179330000 в белорусских рублях ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код BPSBBY2X, УНП 100235669.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 5 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляются участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНАпо продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Жеребковичи

| Наименование недвижимого имущества | Местонахождение недвижимого имущества | Сведения о недвижимом имуществе /информация о земельном участке | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка |
|---|---|---|---|
| **Здание сельского дома культуры** | Брестская область, Ляховичский р-н, д. Своятичи, ул. Орловского, 57 | Здание 2-эт., кирпичное, 1974 г. п., площадь – 1099,9 кв. м, один бетонный подвальный этаж. Земельный участок площадью 0,1345 га, целевое назначение – для обслуживания сельского дома культуры, ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением до 1000 вольт на площади 0,0030 га | |

**Продавец недвижимого имущества –** ОАО «Жеребковичи» Ляховичского района Брестской области, тел. 801633 4 52 23; 4 52 44.
**Начальная цена недвижимого имущества – 38 587 руб. 60 коп.**
**Сумма задатка – 3900 руб. 00 коп.**
**Реквизиты счета для перечисления задатка:**
р/с BY76BAPB30124500800110000000 ЦБУ № 135 г. Ляховичи Региональная дирекция по Брестской области ОАО «Белагропромбанк», БИК BAPBBY2X, УНН 200058414, ОКПО 03802510, получатель платежа – ОАО «Жеребковичи», срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе.
Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона

**Организатор аукциона –** ОАО «Жеребковичи» Ляховичского района Брестской области, тел. 801633 4 52 23; 4 52 44.

Повторный аукцион назначен на **21 декабря 2018 года** в 11.00 по адресу: Брестская область, Ляховичский район, аг. Жеребковичи, ул. Минская, 6а (административное здание общества).

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол в день аукциона; в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Лицом, приравненным к победителю аукциона, считается единственный участник аукциона, давший согласие на покупку предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Договор купли-продажи с победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона. Условие оплаты – в течение 5 рабочих дней с момента подписания договора. По соглашению сторон возможно предоставление рассрочки оплаты.

Порядок оформления участия в аукционе и его проведение определятся Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов, находящихся в собственности ОАО «Жеребковичи».

Извещение с подробной информацией об участии в аукционе, условиях ранее опубликовано в газете «Звязда» за 04.10.2018 г.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: Брестская область, Ляховичский район, аг. Жеребковичи, ул. Минская, 6а, ОАО «Жеребковичи» по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 20 декабря 2018 года включительно.

Землякі

# Ён ніколі не пакінуў бы Вішанек



**Сто пяць гадоў прайшло з дня нараджэння пісьменніка, паэта, перакладчыка, беларускага Карчагіна — Вісарыёна Гарбука. Яго апавяданні (і асабліва зборнік «Твар у палоску») вельмі любілі школьнікі 70-х. Не ўзнікала сумненняў — замалёўкі зроблены педагогам. На вялікі жаль, прыкаваным да ложка.**

Нарадзіўся пісьменнік у вёсцы Шкілякі Полацкага павета. Бацька яго, Сцяпан Гарбук, каб пракарміць сям'ю, ездзіў на заробкі ў Пецярбург. Захапіўшыся ідэямі рэвалюцыі і творчасцю Бялінскага, адтуль жа ён прывёз імя для сына. Праўда, прыняць удзел у барацьбе за светлую будучыню Гарбукустарэйшаму не давялося: праз чатыры гады ён памёр, пакінуўшы ўдаве траіх дзяцей. Двайх у хуткім часе таксама пахавалі. І толькі тады маці рашылася на пераезд — бліжэй да роднага брата, у вёску Вішанькі...

Будучы пісьменнік вучыўся тут у Чашніцкай сямігодцы, потым у Лепельскім педвучылішчы, пасля якога настаўнічаў у суседняй вёсцы Дварэц. Мне пашчасціла гутарыць з яго вучаніцай, былой партызанкай, настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Надзеяй Ільінічнай Грыбоўскай. «Усе мае аднакласнікі, — расказвала яна, — хацелі быць падобнымі на Вісарыёна Сцяпанавіча. Ён умеў знайсці сцяжынку да сэрца кожнага дзіцяці, вельмі прыгожа пісаў на дошцы, а ўжо як расказваў... Не магу забыцца, з якім задавальненнем мы слухалі яго!»

Ва ўсёй акрузе настаўнік слыў самым інтэлігентным і адукаваным, вучыў вясковую моладзь гуляць у шахматы, завочна вучыўся сам, і яго, як здольнага студэнта, хутка перавялі на стацыянарнае аддзяленне педінстытута.

На гэтым яго жыццё, здаецца, вычарпала ліміт шчасця, бо праз некалькі месяцаў студэнта арыштавалі. У астрог шмат дарог, Вісарыёна Сцяпанавіча прывяла туды бяскрыўдная фраза. Студэнты ў інтэрнаце курылі. Ён заўважыў, што гэта шкодзіць здароўю. Яму адказалі, што курыць сам таварыш Сталін! «Для мяне ў падобных пытаннях і Сталін не аўтарытэт», — прызнаўся Гарбук і... чатыры гады правёў на Калыме.

З месцаў пазбаўлення свабоды вярнуўся перад вайной. Працаваў у Механаўскай школе на Віцебшчыне, марыў пісаць, але... З чэрвеня 1941-га і да пачатку 1947-га Вісарыён Гарбук — у радах Чырвонай Арміі, у інжынерных войсках. Непасільная праца, начлегі на мёрзлай зямлі, боль страт адбіліся на здароўі. Першыя прыкметы цяжкай хваробы праявіліся ўжо на фронце.

Усю вайну пісьменнік вёў дзённік, які немагчыма чытаць без хвалявання. Ён, у прыватнасці, нічога не ведаў пра лёс сваіх родных. Толькі пасля вызвалення Беларусі да Вісарыёна Сцяпанавіча прыйдзе страшная вестка, што бабулю, маці і дзядзьку разам са 114 жыхарамі Вішанек фашысты спалілі жывымі.

*Мой водблеск змучанай душы,*
*Мая сястра на раздарожжы,*
*Якім нам словам варажыць,*
*Каб сны хоць шчасцем*
*упрыгожыць?*
*Разбуран дом, няма сям'і,*
*Разносіць вецер папялішча.*
*Хоць частку болі адымі,*
*Хоць на хвіліну гора знішчы.*

Гэтыя радкі напісаны ў чэрвені 1945-га...

Пасля дэмабілізацыі Вісарыён Гарбук вярнуўся ў Вішанькі і, напэўна, ніколі не пакінуў бы іх, калі б не цяжкая хвароба. Урачы паралі яму змяніць клімат, і ён адправіўся ў Пяцігорск. За 13 гадоў — 25 клінік і шпіталяў. Вісарыён Сцяпанавіч наноў вучыўся трымаць алоўак і пісаць хоць па пяць-шэсць радкоў у дзень. У гэтым яго падтрымлівалі чытачы: з Беларусі на Каўказ ішлі лісты ад франтавікоў, ад школьнікаў... Пісьменнік Мікола Хведаровіч, наведаўшы Вісарыёна Сцяпанавіча, быў уражаны мужнасцю гэтага чалавека.

У 1963-м выйшаў першы зборнік твораў Вісарыёна Гарбука, яго прынялі ў Саюз пісьменнікаў, а ў 1979-м прысвоілі званне заслужанага работніка культуры БССР.

...Наш славуты зямляк пайшоў з жыцця ў 1986-м. Пахаваны ў Пяцігорску.

**Ірына Торбіна,**
*г. Чашнікі.*



**Вісарыён Гарбук з настаўнікамі і вучнямі Дварэцкай школы.**

Дзякуй!

## Мост быў вельмі патрэбны!

**На працягу бягучага года ўвага многіх людзей была прыкавана да моста цераз раку Прыпяць. Спачатку даляцела навіна, што ён трэснуў і правіс, што па ім адменены рух, што будуецца новы. А ўрэшце, што мост пабудаваны!**

Тут нічога не скажаш: ён быў вельмі патрэбны, і будаўнікі стараліся як мага хутчэй завяршыць работы. Думаю, ім прыйшлося вельмі нялёгка, бо працы было шмат і прытым складанай. Але ж яны справіліся!

Ад імя ўсіх раней «адрэзаных» (калі можна гэтак сказаць) землякоў і гасцей, якія любяць прыязджаць у нашы мясціны, хачу шчыра падзякаваць будаўнікам за іх працу!

**І. М. Матох,**
*в. Запясочча, Жыткавіцкі раён.*

Чалавек — чалавеку

## Каб дабро не прапала?..

**Ганна штогод варыла варэнне... Што зусім не дзіўна, бо ягады, вішні, слівы і многае іншае ёй купляць не трэба было — прывозіла сваё, з вёскі, і кожнае лета. У выніку ўсе паліцы ў досыць прасторнай кладоўцы гарадской кватэры былі застаўлены слоікамі. Не паспявала сям'я з'ядаць... Са старога, чула, людзі гналі гарэлку, аднак Ганна на гэта доўга не згаджалася, бо муж яе не піў хіба тады, калі не было чаго альбо за што...**

У тую вясну яны загадзя збіраліся ў вёску па бярозавы сок. Хацелі ўволю папіваць яго, нарыхтаваць у запас, для чаго набралі з сабой (балазе знаёмы на машыне падвозіў) пустых трохлітровікаў і (не прападаць жа дабру!) поўных слоікаў са старым варэннем.

На месцы Мікола тут жа ўзяўся за справу: выцягнуў два бітоны, завёў гарэлку, з нецярпеннем чакаў, калі «паспее» брага. І за гэты час чаго толькі не зрабіў па гаспадарцы!

Але ж вось наступіў доўгачаканы дзень. З самага ранку Мікола дзяжурыў «ля апарата». І нават не адзін. Ці не на пах любімай вадкасці завітаў швагер — муж Міколавай сястры. Яны (гаспадыні не да іх было) «пробу здымалі», аж пакуль абодвух не схіліла ў сон... Так што завяршаць «аперацыю» Ганне давялося самой.

Што крыўдна — не толькі гэту. Адной потым прыйшлося рамантаваць плот, перабіраць бульбу, вазіць на грады гной, ускопваць зямлю, бо Мікола ўвесь свой час стаў праводзіць за чаркай і спыніцца ўжо не мог...

А віною таму — прагнасць. Баімся, каб не прапала дабро. А што чалавек прападае... Выходзіць, няхай?

**Таццяна Чэкед,**
*г. Гомель.*

Шчасце жыць

## «БЕЗ НЯВЕСТКІ МЯНЕ ДАЎНО НЕ БЫЛО Б»

**...Праўду кажуць: шмат каму жыццё даецца, ды не ў кожнага ўдаецца. Так атрымалася, што мне шмат даводзіцца кантактаваць з людзьмі пажылымі, з інвалідамі. Радуюся, калі паміж імі і іх нашчадкамі пануюць душэўная гармонія, узаемная павага і клопат. Па сабе ведаю, як гэта важна.**

Ніне Сямёнаўне Самец з Беразіна ўжо пад 90, і, на вялікі жаль, у сваім дыхтоўным доме яна жыве адна. Спачатку памёр муж, з якім вырасцілі двух цудоўных сыноў, потым у лепшы свет і ў самым росквіце сіл сышлі і яны. Ніна Сямёнаўна засталася...

Ды не варта, лічыць, Богу грашыць, бо ёй ва ўсім дапамагае любімая нявестка Раіса Канстанцінаўна. «Без яе дапамогі я даўно памерла б, — прызнаецца Ніна Сямёнаўна. — І ў доме, і ў гародзе — яе праца. Іншыя дочкі пра матуль так не клапоцяцца, як мая Рая пра мяне. Хаця хто я ёй такая...»

Ёсць у гэтых словах — з уласнага досведу ведаю — горкая доля праўды. Некалі раней цэнтра, які займаўся б праблемамі пажылых, а тым больш дома састарэлых пры аддзелах сацыяльнай абароны не было. Дагэтуль у памяці, як прывезлі адну бабульку ў Пагосцкую бальніцу, а там — рамонт. Куды падзецца з жанчынай? Яна нам сама падказвае: «У мяне тут сын жыве. Можа, ён на нейкі тыдзень узяў бы?» Паехалі да сына, зайшлі ў хату. Нявестка, можна сказаць, з парога нам: «Навошта вы яе прывезлі? Я не толькі ў хату, я на двор яе не пушчу!» Аж вусцішна стала — нам... Што ўжо казаць пра жанчыну?! Прыйшлося везці яе ў Багушэвіцкую сельскую бальніцу, а адтуль — у дом-інтэрнат для састарэлых у Лагойск...

Узорнасць жа адносін да сваёй свекрыві з боку Раісы Канстанцінаўны Нікалаевай адчуваецца на кожным кроку. Апошнім разам па сямейных абставінах яна паехала ў Мінск да дачкі, але ж на свякроў не забылася — пазваніла, каб пацікавіцца здароўем. Адказу аднак... не пачула. Устрывожаная нявестка падняла на ногі суседзяў, знаёмых. І якраз паспела: Ніна Сямёнаўна была ў непрытомнасці — трэці інфаркт.

Дзякаваць богу, урачы выхадзілі жанчыну, далі шанц прадоўжыць жыццё.

А яно — якое б ні было (цяжкае, трывожнае, з горкім прысмакам страт...) — усё ж шчасце. У любым узросце.

**Ніна Бурко,**
*г. Беразіно.*

Што бачу...

# Пачынаецца снегапад

**Я нарадзілася ў невялікай вёсачцы, якую з усіх бакоў акружае лес. З дзяцінства родная прырода была для мяне цэлым светам: чароўным, непаўторным, здольным натхняць — на невялічкія пейзажныя замалёўкі.**

* * *

Восень. Ветрык. Бярозкі з высокага берага ракі махаюць жоўтымі галінамі, іх дзіўныя лісточкі-залатовачкі шырокім веерам падаюць долу, на ціхую плынь.

І раптам над ёю — пранізлівы крык. Гэта журавы, утварыўшы вялізны круг, аблятаюць родны куточак. Яны то апускаюцца нізка-нізка, да самай вады, то падымаюцца ўвысь, каб кінуць апошні пагляд на родныя мясціны, каб праспяваць ім сваю развітальную песню.

* * *

Лістапад — пачатак... Буйства колераў і адценняў. Сярод зялёных яловых лапак — тонкія, стромкія ствольні бяроз. Вочы міжволі ўздымаюцца ўверх, да золата іх лістоты. Туды ж імкнецца душа і тут жа... апускаецца ў пяткі, бо насустрач па ледзь бачнай сцяжынцы ідзе... лось. Яго цёмная магутная шыя плаўна пераходзіць у вялікае, бліскучае тулава, яго рогі нібы карона — аж зіхацяць на сонцы.

Лось ну пэўна ж ведае, што ён прыгожы. І тым ганарыцца.

* * *

Зазімак. Холад. Але восень усё яшчэ не здаецца: красуе фарбамі, гарыць рубінавым полымем, над якім аднекуль з'яўляецца белы пух. Ён кружыць спачатку плаўна, нясмела, а потым усё шпарчэй і шпарчэй. Бялюткія сняжынкі, падхопленыя ветрам, імкліва падымаюцца ўгору, і, станцаваўшы свой першы зімовы танец, павольна падаюць на зямлю. Пачынаецца снегапад.

* * *

Цішыня. Зялёна-белая ўрачыстасць. Елкі, засыпаныя снегам, стаяць у задуменні і ціхутка ківаюць пухнатымі галовамі.

Але што гэта: з адной і раптам — ледзяністы пыл? Гэта вяртлявая вавёрка кружыцца ў голлі дрэў, гайдаецца ў сонным прыволлі, парушае лясны спакой, быццам гаворыць: «Хто тут галоўны? Я!»

* * *

...Не адвесці вачэй ад аконнай шыбы! Мароз-умелец пастараўся на славу: чаго тут толькі няма?! Густы снег, мудрагелістыя галіны асін і клёнаў, графіка вецця вольхаў, вочкі верасу, пацеркі ландыша і ўсёды — карункі, карункі, карункі... На маляўнічае шкло ўпаў сонечны праменьчык, і ажыў, заіграў пейзаж. Крыштальная казка!

**Ірына Салата,**
*г. Гродна.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

# ЯК ПАСЛУГІ СТАНОВЯЦЦА

**ГАРАДЖАНЕ імкнуцца, каб усё, што ім патрэбна ў штодзенным жыцці, знаходзілася побач — у крокавай даступнасці: крама каля дома, пошта пажадана не далей за суседнюю вуліцу, рамонт абутку, аддзяленне банка, бібліятэка, цырульня, аптэка, майстэрня па рамонце адзення — у сваім раёне, каб максімум знаходзілася не далей за некалькі прыпынкаў грамадскага транспарту. А што казаць пра вяскоўцаў, тым больш састарэлых? Ім патрэбна ўсё тое ж самае.**
**Дзеля выканання сацыяльных стандартаў на дапамогу прыходзяць так званыя паслугі на колах, якія дапамагаюць людзям у вырашэнні іх штодзённых клопатаў. Лекі для душы — кнігі і перыёдыку — дастаўляюць нават у нядзелю, калі асалодзе чытання вяскоўцы могуць прысвяціць больш вольнага часу. Аб гэтым можна даведацца з матэрыялу нашага ўласнага карэспандэнта па Брэсцкай вобласці, а яшчэ аб тым, што бібліятэкар не адмаўляе чытачам у пакупцы і звычайных лекаў, калі ім гэта патрэбна. Як працуюць «мабільныя бытоўкі» на «Газелі» ў Віцебскім рэгіёне, паштовыя паслугі — на Гомельшчыне і прывозяць самае неабходнае аўтакрамы для пакупнікоў у вёскі Міншчыны, дзе жыве нават меней за пяць чалавек, — мы сабралі ўсю гэтую інфармацыю ў нашым спецыяльным праекце «Рэгіёны: па сутнасці справы».**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Брэстчына

## Нават у самыя малыя і аддаленыя

### Кніжны аўтобус аб'язджае 24 вёскі раёна штотыдзень

**У Алены ЗІНЧУК не вельмі распаўсюджаны род заняткаў, яна — бібліятэкар на колах. Прынамсі, у Маларыцкім раёне яна адна такая. Аб адзінаццатай раніцы Алена Мікалаеўна выпраўляецца ў дарогу. Перад гэтым трэба зверыць спіс папярэдніх заявак, абнавіць змесціва скрынь з перыёдыкай, прыхапіць навінкі, а таксама некаторыя рэчы не па тэме. Але пра апошняе крыху пазней.**


Алена ЗІНЧУК.

Кніжны аўтобус ходзіць па вёсках раёна ўжо сёмы год. Асаблівая ўвага аддаецца тым населеным пунктам, дзе раней былі стацыянарныя бібліятэкі і людзі прывыклі чытаць. А цяпер яны ходзяць да гэтага мікрааўтобуса з асаблівым жаданнем.

— Мы ж разумеем, што перасоўная бібліятэка выконвае і пэўную сацыяльную функцыю, — гаворыць **дырэктар цэнтралізаванай раённай бібліятэчнай сістэмы Наталля КУЗЬМІЦКАЯ.** — У нашых падшэфных вёсках няма ніводнага грамадскага аб'екта, крамы, клубы, школы даўно закрылі. І ў добрае надвор'е людзям ёсць нагода сабрацца разам у чаканні бібліятэкара, пагаманіць, абмяняцца навінамі. Да большасці чытачоў шаноўнага ўзросту Алена Мікалаеўна заходзіць дадому. І яны рады такім сустрэчам. Такія як, напрыклад, ветэран вайны Піліп Несцеравіч Дзібук 1927 года нараджэння. І ён яшчэ чытае! Нярэдка ветэран замаўляе кнігу «Памяць» Маларыцкага раёна, любіць яшчэ і яшчэ раз звярнуцца да гісторыі свайго раёна, населенага пункта.

Сярод наведвальнікаў бібліятэкі на колах ёсць дзве жанчыны 1930 года нараджэння, таксама даволі актыўныя чытачкі. Праўда, большасць прозвішчаў у фармулярах бібліятэкара — людзі працаздольнага ўзросту, таксама чытаюць 48 дзяцей, — працягвае Наталля Аляксееўна.

Фонд перасоўнай бібліятэкі складаецца з чатырох тысяч экзэмпляраў. Але гэта не значыць, што дастаўляюцца толькі гэтыя кнігі. Калі паступае заяўка на канкрэтнае выданне, супрацоўнік бярэ кнігу з абанемента раённай альбо дзіцячай бібліятэкі і дастаўляе ў вёску. Вось і гэтым разам папрасілі твор Генрыка Сянкевіча, — расказала Алена Зінчук. — А так пенсіянеры замаўляюць шмат духоўнай літаратуры, ахвотна бяруць часопісы пра вядзенне гаспадаркі, саду, агарода. Апошнім часам папулярнасцю карыстаюцца дзіцячыя казкі.

Яшчэ супрацоўнікі бібліятэкі расказалі, што графік работы перасоўнага ачага культуры яны імкнуліся зрабіць максімальна зручным для сельскіх жыхароў. У адных вёсках «прывязалі» свой прыезд да графіка аўтакрамы. Людзі збяруцца ў адным месцы зрабіць пакупкі, потым прыйдуць і ў бібліятэку. Паводле пажадання чытачоў, кніжны аўтобус працуе ў нядзелю. У гэты дзень вяскоўцы менш займаюцца гаспадарчымі справамі і могуць прысвяціць больш часу асалодзе чытання. Адным словам, у 24 вёсках раёна чакаюць сваю бібліятэку на колах у адпаведнасці з графікам.

— За столькі гадоў, лічы, усіх сваіх чытачоў ведаю, — расказвае Алена Мікалаеўна, ва ўсіх ёсць мой мабільны тэлефон. Бывае званяць не толькі з просьбай пра тую ці іншую кніжку, просяць, напрыклад, купіць лекі. Дык мне ж не цяжка забегчы ў аптэку. А бібліятэка, як аказалася, патрэбная нават у самых аддаленых і маленькіх вёсках.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Маларыцкі раён.*

Магілёўшчына

## ДОБРЫ ГАНДАЛЬ ТАМ, ДЗЕ ЁСЦЬ ВЫБАР

Улічваючы, што ў стацыянарных крамах гэтага рытэйлера можна купіць што заўгодна па больш прыемных цэнах, на вёсцы пра сустрэчу з ім толькі марацъ. У Магілёўскай вобласці працуе 255 аўтакрам, але ад «Еўраопта» ўсяго дзве. Прычым абедзве ў Круглянскім раёне. Вось ужо чацвёрты год яны паспяхова суіснуюць тут з аўтакрамамі ад спажыўкааперацыі і мясцовай ПМК-266. На тэрыторыі 143 населеныя пункты, і еўраоптаўская аўталаўкі наведваюць 128 з іх. Дзве машыны курсіруюць па 11 маршрутах, аб'язджаюць вёскі шэсць дзён на тыдзень. Адна аўтакрама паспявае абслужыць за дзень 18-19 вёсак. У асартыменце ўсё, што можна знайсці на паліцах стацыянарнай крамы сеткавіка. Іх, дарэчы, у Круглым дзве. І загружаецца аўталаўка менавіта ад іх. Усяго, як паведаміла **дырэктар круглянскіх «еўраоптаўскіх» крам Таццяна АЎТУШЭНКА**, на вёску пастаўляецца 520 пазіцый, прычым шмат які тавар у разнавіднасцях. Напрыклад, учора ў рэйс «паехалі» сем відаў малака, чатыры кефіру, па шэсць смятаны і тварагу, пяць свежамарожанай рыбы, восем відаў мяса, пяць фаршу ў замарожаным і ахалоджаным выглядзе, 37 відаў каўбас, а таксама агародніна, садавіна, кансервы, напоі, хлебабулачныя вырабы і шмат чаго іншага.

— І нават калі чагосьці не знайшлося ў асартыменце, пакупнік можа пакінуць сваё пажаданне ў кнізе заказаў — абавязкова прывязём, хоць сто кілаграмаў бульбы, — смяецца Таццяна Віктараўна.

Дарэчы, самая далёкая вёска, куды даязджае аўтакрама, Шапялевічы, знаходзіцца за 30 кіламетраў ад райцэнтра. Гандаль з улікам дарогі пачынаецца з 10 гадзін, а заканчваецца ў 18.00. Хоць летам, кажа дырэктар, машыны вярталіся а дзясятай гадзіне вечара. З улікам дачнікаў пакупнікоў становіцца больш, а тут прывыклі працаваць ад апошняга кліента.

— Мы з самага пачатку былі не супраць таго, каб на вёсцы працаваў «Еўраопт», — кажа **начальнік аддзела эканомікі Круглянскага райвыканкама Ала ШАЎЦОВА.** — Але дзяліць па прынцыпе адным лепшае, другім — што засталося, не сталі. Агучылі адразу: працуеце паралельна з усімі. І сёння ў нас тры ўласнікі, якія абслугоўваюць вяскоўцаў. Улічваючы, што «Еўраопт» прыйшоў пазней за ўсіх, прапанавалі тое, што засталося. Яны пагадзіліся на ўсё, нават калі трэба было ехаць у населеныя пункты, дзе жывуць два-тры чалавекі. Зразумела, што лепей працаваць у вялікіх населеных пунктах, але нават аднаму чалавеку патрэбна ўвага.

Для вёскі, лічаць у раёне, гэта крок наперад. Бо канкурэнцыя прымушае ўсіх лепей працаваць. Ёсць населеныя пункты, дзе адначасова гандлююць два, а то і ўсе тры ўласнікі.

— Часам мы абараняем свой рынак не на карысць запатрабаванням вяскоўцаў. Добры гандаль будзе тады, калі ён не адзіны, — лічыць Ала Шаўцова. — Прыйшоў «Еўраопт», і астатнія падцягнуліся. У выніку выйграў сельскі чалавек.

— А для эканомікі раёна якая карысць? — цікаўлюся ў суразмоўцы.

— Крыху складаней, таму што «Еўраопт» у раёнах не рэгіструецца, асноўных падаткаў мы ад яго не маем. Толькі падаходны, падаткі на зямлю і нерухомасць. Гэта зусім мала ад таго, што маглі б мець. З іншага боку, гэта дадаткова створаныя рабочыя месцы і здавальняючы ўзровень абслугоўвання. А грошы ўсё роўна застаюцца ў вобласці, з бюджэту якой раёны, па сутнасці, і датуюцца. Увогуле, тое, што мы зарабілі, да нас і вяртаецца, але крыху па-іншаму. Шчыра кажучы, у нас сваёй спажыўкааперацыі няма — працуе Бялыніцкае аддзяленне. І ўсё, што яны выручаюць, ідзе ў бюджэт Бялыніцкага раёна. Напэўна, таму еўраоптаўскім аўтакрамам складана прабіцца на тэрыторыі іншых раёнаў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# БОЛЬШ МАБІЛЬНЫМІ

Гомельшчына

## ЛЮБЫ ТАВАР ДАСТАВІЦЬ ПОШТА

### Газеты і лісты прыедуць на вёску таксама згодна з графікам



**На Гомельшчыне сёння 52 перасоўныя аддзяленні паштовай сувязі абслугоўваюць 772 населеныя пункты. Гэта азначае, што больш за 45 тысяч вяскоўцаў вобласці атрымліваюць карэспандэнцыю «з колаў».**

Зразумела ж, не толькі газеты і часопісы дастаўляюць паштавікі ў маланаселеныя і аддаленыя вёскі. **Намеснік дырэктара Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Марына ПЕРАГУДА** расказвае, што мабільныя пошты па сваёй функцыянальнасці і тэхнічнай абсталяванасці з'яўляюцца паўнавартаснымі аддзяленнямі сувязі:

— Насельніцтву аказваецца самы шырокі комплекс паслуг. Перасоўныя аддзяленні паштовай сувязі абсталяваны анлайн-каналамі, таму жыхарам апроч традыцыйных паштовых паслуг даступныя самыя сучасныя сэрвісы. У машыне ёсць ноўтбук, прынтар, абсталяванне для ўзважвання і счытвальнікі банкаўскіх пластыкавых картак. Вітрына пад тавары спажывецкага попыту абсталявана для рухомага транспарту. Арганізавана рэалізацыя тавараў спажывецкага попыту па заяўках насельніцтва.

Да таго ж, гаворыць Марына Антонаўна, у кожным населеным пункце арганізаваны месцы стаянак, дзе ёсць шыльда з указаннем рэжыму работы. Так што кожны вясковец ведае, калі чакаць паштовую машыну з любімай газетай. Час стаянкі складае ад 20 хвілін да гадзіны. Ён залежыць ад колькасці людзей, што жывуць у канкрэтнай вёсцы. У асобных вялікіх населеных пунктах арганізавана некалькі месцаў стаянкі аўтапошты.

Дастаўку пошты і друкаваных СМІ звычайна выконвае кіроўца ці начальнік перасоўнага аддзялення паштовай сувязі. Для гэтага ў населеных пунктах ёсць групавыя абаненцкія шафы і паштовыя скрыні для прыёму пісьмовай карэспандэнцыі.

Між тым вопыт арганізацыі паштовых перасовак мае яшчэ савецкую гісторыю. Пачыналася гэтая работа з асноўнай мэтай наблізіць паслугі пошты да людзей. Сёння ўсе разумеюць, што ўтрымліваць вялікую колькасць стацыянарных аддзяленняў пошце не па сілах. Але ж па сілах арганізаваць усё так, каб жыхары нават самых далёкіх вёсак не адчувалі сябе забытымі.

— Такі фармат абслугоўвання дазваляе павялічыць даступнасць і якасць не толькі паштовых, але і непрофільных паслуг, — адзначае суразмоўніца. — Па прадукцыйнасці адно перасоўнае аддзяленне паштовай сувязі здольна замяніць каля пяці стацыянарных у невялікіх і цяжкадаступных населеных пунктах. Якасць абслугоўвання насельніцтва не пагоршылася. Выконваецца сацыяльны стандарт па абслугоўванні насельніцтва — дастаўка ажыццяўляецца пяць разоў на тыдзень. Дадам, што за апошнія два гады ў раённых цэнтрах Гомельскай вобласці заменена на новую 21 спецыялізаваная машына, прызначаная для гэтых мэт.



**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Віцебшчына

## «БЫТОЎКА» ДАЕДЗЕ ДА КОЖНАГА

**Асаблівасць Віцебшчыны ў тым, што тут самая вялікая колькасць населеных пунктаў у краіне — каля 6,3 тысячы. Але, незалежна ад месца пражывання, нават у самых аддаленых і маланаселеных вёсках грамадзяне атрымліваюць комплекс бытавых паслуг.**

Як паведамілі ў галоўным упраўленні гандлю і паслуг Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, за дзевяць месяцаў бягучага года жыхарам вобласці аказалі бытавых паслуг на 73,6 мільёна рублёў. Для параўнання, за аналагічны леташні перыяд — 70,3 мільёна.

**Начальнік аддзела арганізацыі гандлю і бытавых паслуг галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Віцебскага аблвыканкама Наталля ЕЛІСЕЕВА** растлумачыла, што асноўныя бытавыя паслугі — рамонт швейных вырабаў, абутку, мэблі, бытавых машын і прыбораў. А яшчэ — рамонт і тэхнічнае абслугоўванне бытавой радыёэлектроннай апаратуры. Плюс — паслугі пракату, цырульні, фотапаслугі, прыём заказаў у пральню, хімчыстку, выраб рытуальных тавараў...

Звыш 3,3 тысячы суб'ектаў гаспадарання займаюцца «бытоўкай»: 34 % — юрыдычныя асобы, 66 % — індывідуальныя прадпрымальнікі.

У сельскай мясцовасці бытавыя паслугі аказваюць каля 360 суб'ектаў гаспадарання (з іх —71 % — індывідуальныя прадпрымальнікі, 29 % — фірмы, прадпрыемствы). Сёлета колькасць аб'ектаў бытавога абслугоўвання, размешчаных у глыбінцы, павялічылася больш чым на 30.

Формы абслугоўвання для кожнага сельскага населенага пункта вызначаюцца з улікам попыту і патрэбы жыхароў.

Як удакладнілі ў галоўным упраўленні, даступнасць асноўных відаў бытавых паслуг вяскоўцам забяспечваецца не толькі за кошт функцыянавання сеткі стацыянарных аб'ектаў, але і арганізацыяй выязнога абслугоўвання, аказання паслуг па заяўцы.

Абслугоўванне жыхароў аддаленых і маланаселеных вёсак, як правіла, ажыццяўляюць перасоўныя комплексныя прыёмныя пункты. Яны курсіруюць па замацаваных за імі тэрыторыях у адпаведнасці з графікамі. Апошнія ўзгоднены з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ўлады.

«Мабільныя бытоўкі» дазваляюць аказваць некаторыя паслугі на месцы. Напрыклад, у вёсцы можна падстрыгчыся, сфатаграфавацца, а яшчэ зрабіць дробны рамонт швейных вырабаў.

Летась і сёлета ў вобласці, каб пашырыць выязное бытавое абслугоўванне, прадпрыемствы купілі пяць аўтамабіляў («ГАЗ» 2705, якія ў народзе называюць «Газель»). А ўсяго ў парку «бытовак на колах» больш за дваццаць машын.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Міншчына

## Пакупнік не ідзе? Мы самі прыйдзем да яго!

**Гандлёвае абслугоўванне 3580 населеных пунктаў Мінскай вобласці, дзе пражывае больш за 100 тысяч чалавек, ажыццяўляюць 143 аўтакрамы спажывецкай кааперацыі. Сярод іх 150 вёсак з насельніцтвам да пяці чалавек, 950 — ад шасці да дзесяці жыхароў. Нягледзячы на тое, што шэраг маршрутаў стратныя, кааператары ўважліва адносяцца да патрэб патэнцыйных пакупнікоў.**

Усяго распрацавана 378 разнастайных маршрутаў, якія прадугледжваюць абслугоўванне аднаго населенага пункта з перыядычнасцю два-тры разы на тыдзень, у тым ліку тройчы ў тыдзень аўтакрамы заходзяць у 1645 вёсак. У сярэднім адна аўтакрама штодзень абслугоўвае 15 вёсак: працягласць маршрутаў руху — ад 40 да 200 кіламетраў. Для кожнай машыны распрацаваны графік з указаннем часу прыбыцця ў населены пункт і стаянкі.

За апошнія гады сучасная аўтакрама істотна змянілася як па знешнім выглядзе, так і па ўнутраным напаўненні. Напрыклад, машыны на базе шасі «МАЗ» маюць дзве-тры адзінкі халадзільнага абсталявання, электронныя вагі, касавы апарат, умывальнік. Усе магазіны «на колах» маюць банкаўскія плацежныя тэрміналы для безнаяўных разлікаў.

Халадзільнае абсталяванне дазваляе забяспечыць дастаткова шырокі пералік харчовых тавараў. Гэта натуральная малочная прадукцыя, сыры, свежамарожаная рыба, каўбасы, марожанае і шмат чаго іншага. У асартыменце не менш за 80 найменняў харчовых і 25 нехарчовых тавараў. Абавязкова тут будзе і прадукцыя вытворчасці спажыўкааперацыі: хлебабулачныя і кандытарскія вырабы, мяса і паўфабрыкаты з яго, мяса птушкі і паўфабрыкаты з яе, мінеральная вада, кансервы з агародніны і садавіны. Рэалізуюцца таксама прадукты, якія выпускаюцца пад уласнай гандлёвай маркай.

На тавары, якіх няма ў асартыментным пераліку, прымаюцца заяўкі. Кааператары праводзяць дваровы абход для таго, каб даведацца, што патрэбна насельніцтву. Ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, пажылым людзям аказваюцца дадатковыя паслугі па дастаўцы тавараў на дом. Акрамя таго, у аўтакрамах рэалізуецца пэўны асартымент акцыйнай прадукцыі, у святочныя дні ладзяцца разнастайныя маркетынгавыя акцыі з уручэннем падарункаў грамадзянам паважнага ўзросту. Не застаюцца без увагі і гараджане, якія выязджаюць на лета ў садовыя таварыствы і дачныя кааператывы. Ім не трэба думаць, дзе ўзяць неабходныя прадукты: везці з сабой са сталіцы, купляць у райцэнтры або ў найбліжэйшым населеным пункце. Гэтыя клопаты цалкам узяў на сябе Мінскі аблспажыўсаюз. Ужо каторы год рэгіянальныя арганізацыі спажывецкай кааперацыі паспяхова выконваюць пастаўленую перад імі задачу: з наступленнем вясенне-летняга перыяду максімальна задаволіць патрэбы адпачывальнікаў і ўласнікаў больш як тысячы дачных таварыстваў з дапамогай сезонных гандлёвых аб'ектаў і аўтакрамаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 201/С-13039, наименование – жилой дом, назначение – здание одноквартирного жилого дома площадью 43,8 кв. м по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Стодолищенский с/с, д. Улишицы, ул. Северная, д. 8, расположенное на земельном участке с кадастр. № 221880420101000045 площадью 0,2500 га. Составные части и принадлежности: сени, восемь сараев, уборная, навес, крыльцо. **Нач. цена:** 1 755,00 руб. **Задаток:** 175,50 руб.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен соответствующим Управлением Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, созданного в нем межрайонного отдела, в котором имущество состоит на учете, но не более чем на 20 рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенную доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе; документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский языки; представителями организаций – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK3012000109330006678 2 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 09.01.2018, 20.03.2018, 03.05.2018, 07.07.2018, 16.08.2018.

**Повторный аукцион состоится 20.12.2018 в 11.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 05.12.2018 с 8.30 по 19.12.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). **Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

по продаже имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, организуемого ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Лот № 1.** Изолированное помещение, расположенное на 2-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 229,8 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. Имущество обращено в доход государства у ООО «Вистан». **Нач. цена:** 39 744 руб. **Задаток:** 3 974,40 руб.

**Лот № 2.** Изолированное помещение, расположенное на 2-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 300,5 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. Имущество обращено в доход государства у ООО «Вистан». **Нач. цена:** 58 752 руб. **Задаток:** 5 875,20 руб.

**Лот № 3.** Изолированное помещение, расположенное на 1-м этаже капитального строения с инв. № 200/С-50901 общей площадью 291,3 кв. м, назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Димитрова, 36/23. Имущество обращено в доход государства у ООО «Вистан». **Нач. цена:** 50 976 руб. **Задаток:** 5 097,60 руб.

**Условия:** 1. Участник аукциона, ставший победителем, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен соответствующим Управлением Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, созданного в нем межрайонного отдела, в котором имущество состоит на учете, но не более чем на 20 рабочих дней; возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. 2. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект (Объекты) недвижимости осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь. 3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел.(0212) 24-63-14.

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **www.marketvit.by**. Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». При оформлении лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет: копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица и его паспорт; паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенную доверенность для представителя физического лица; копию платежного документа, подтверждающего внесение в установленном порядке задатка в размере 10 % от начальной цены продажи; организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе; документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на русский или белорусский языки; представителями организаций – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 04.11.2017, 06.01.2018, 21.02.2018, 17.03.2018, 03.05.2018, 04.07.2018, 16.08.2018.

**Повторный аукцион состоится 20.12.2018 в 11.30** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** в рабочие дни с 05.12.2018 с 8.30 по 19.12.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 7). **Конт. тел.: (0212)24-63-14, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский рыбокомплекс» (продавец) в лице управляющего в деле о банкротстве Журова С. В. извещает о проведении 21 декабря 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением на 20 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| | **Условие продажи: 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16 | | | |
| 1 | **В составе: Капитальное строение с инв. № 300/С-2574** общей площадью **2 018,7 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание цеха по переработке рыбы. Капитальное строение с инв. № 350/С-51854** общей площадью **897,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание санитарное обработки тары. Капитальное строение с инв. № 350/С-51855** общей площадью **201,1 кв. м,** назначение – здание административное, наименование – **одноэтажное кирпичное административное здание. Капитальное строение с инв. № 350/С-75486** общей площадью **2 721,1 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание холодильника. Местонахождение:** Гомельская обл., Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Шилова, д. 16. **Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания производственных зданий по ул. Шилова,16. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002000638** общей площадью **2,0237 га (право постоянного пользования, доля в праве 1/1).** Здание административно-хозяйственная, холодная пристройка (инв. № 0003). Капитальное строение (инв. № 0004, № 0055, № 0054) общей площадью **167,3 кв. м,** наименование – **здание бойлерной.** Капитальное строение (инв. № 0007) общей площадью **111,0 кв. м,** наименование – **здание павильона ПК-24 (бытовки грузчиков)**. Капитальное строение (инв. № 0008), общей площадью **949,9 кв. м**, наименование – **одноэтажное металлическое здание склад «Японское море»**. Капитальное строение (инв. № 0006) общей площадью **30,0 кв. м,** наименование – **погреб-склад ГСМ.** Капитальное строение (инв. № 0005) общей площадью **12,8 кв. м**, наименование – **здание проходной**. **Подробный и полный перечень имущества по лоту № 1 опубликован в газете «Звязда» от 13.09.2018 г. № 176 (28792)** | **2 135 600,80** | 106 780,04 | 213 560,08 |
| 2 | Весы ВП-15Ф.2 эл. печатающие фасовочные (инв. № 3257) | **72,00** | 3,60 | 7,20 |
| 3 | Весы ТВ-М-600,2-А1(Н) товарные с автономным питанием (инв. № 3271) | **256,00** | 12,80 | 25,60 |
| 4 | Витрина холодильная Ариэль ВНЗ-130 (инв. № 3319) | **240,00** | 12,00 | 24,00 |
| 5 | Витрина холодильная Вита 0,1Э-1,1 (инв. № 3344) | **664,00** | 33,20 | 66,40 |
| 6 | Витрина холодильная Белинда ВУ 2-180 (инв. № 3324) | **880,00** | 44,00 | 88,00 |
| 7 | Витрина холодильная Белинда ВН 2-180М2 (инв. № 3325) | **496,00** | 24,80 | 49,60 |
| 8 | Витрина холодильная Белинда ВУ 2-200 (инв. № 3322) | **800,00** | 40,00 | 80,00 |
| 9 | Витрина холодильная ВН 3-180 Ариэль (инв. № 3299) | **496,00** | 24,80 | 49,60 |
| 10 | Витрина холодильная ВС 3-180 Ариэль (инв. № 3300) | **456,00** | 22,80 | 45,60 |
| 11 | Витрина холодильная ВХН-0,25 ТАИР 1221н (1,2) (инв. № 3312) | **296,00** | 14,80 | 29,60 |
| 12 | Витрина холодильная ВХН-0,25 ТАИР 1221н (1,2) (инв. № 3317) | **96,00** | 4,80 | 9,60 |
| 13 | Витрина холодильная ВХН-0,25 ТАИР 1221н (1,2) (инв. № 3311) | **192,00** | 9,60 | 19,20 |
| 14 | Ларь морозильный ELCOLD CX 35 (3 корзины, замок) (инв. № 3314) | **408,00** | 20,40 | 40,80 |
| 15 | Морозильный ларь для мороженого IC300 SC (2 корзины) (инв. № 3298) | **520,00** | 26,00 | 52,00 |
| 16 | Морозильный ларь для мороженого IC300 SC (3 корзины) (инв. № 3297) | **520,00** | 26,00 | 52,00 |
| 17 | Печь муфельная учебная ПМ-10-01 (инв. № 3216) | **744,00** | 37,20 | 74,40 |
| 18 | Счетчик денег «Magner 35DS» (инв. № 3065) | **616,00** | 30,80 | 61,60 |
| 19 | Термостат ТС-80М2 (инв. № 3182) | **328,00** | 16,40 | 32,80 |
| 20 | Термостат ТС-80М2 (инв. № 3183) | **328,00** | 16,40 | 32,80 |
| 21 | Упаковщик TW-450 (инв. № 3342) | **80,00** | 4,00 | 8,00 |
| 22 | Шкаф холодильный R1400 VC (инв. № 3320) | **960,00** | 48,00 | 96,00 |
| 23 | Шкаф холодильный ШХ-0,7 ДС(н) (инв. № 3313) | **584,00** | 29,20 | 58,40 |
| 24 | Шкаф холодильный R1400 Рапсодия (инв. № 3295) | **1 040,00** | 52,00 | 104,00 |
| 25 | Шкаф холодильный серии R1400L Рапсодия (инв. № 3301) | **880,00** | 44,00 | 88,00 |
| 26 | Станок точильно-шлифовальный 3К 634 (инв. № 3020) | **784,00** | 39,20 | 78,40 |
| 27 | Станок точильно-шлифовальный 3К 634 (инв. № 3021) | **960,00** | 48,00 | 96,00 |
| 28 | Токарно-винтовой станок 1А-62 (инв. № 3018) | **1 920,00** | 96,00 | 192,00 |
| 29 | Машина разгрузочно-моечная МРМ Х940М (инв. № 3290). Компрессор МК-3-100 (инв. № 3304) | **5 600,00** | 280,00 | 560,00 |
| 30 | Хладотермостат ХТ-3/70-1 (инв. № 3185). | **776,00** | 38,80 | 77,60 |
| 31 | Ларь морозильный ELCOLD EL 53 (4 корзины, замок) (инв. № 3318) | **320,00** | 16,00 | 32,00 |
| 33 | HD10/21 Plus аппарат выс. давл. без подогрева вод. (инв. № 3186) | **560,00** | 28,00 | 56,00 |
| 34 | Автоклав ВК-30 (инв. № 3179) | **2 160,00** | 108,00 | 216,00 |
| 35 | Ванна нерж. 1630*550*860 гл (инв. № 3225) | **320,00** | 16,00 | 32,00 |
| 36 | Ванна нерж. 1630*550*860 гл (инв. № 3226) | **320,00** | 16,00 | 32,00 |
| 37 | Ванна ВК (2шт) (инв. № 3230) | **640,00** | 32,00 | 64,00 |
| 39 | Вентилятор YWF4S-630 BD (инв. № 3447) | **152,00** | 7,60 | 15,20 |
| 40 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3442) | **176,00** | 8,80 | 17,60 |
| 41 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3443) | **176,00** | 8,80 | 17,60 |
| 42 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3444) | **176,00** | 8,80 | 17,60 |
| 43 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3445) | **176,00** | 8,80 | 17,60 |
| 44 | Вентилятор YWF4S-630 BF (инв. № 3446) | **176,00** | 8,80 | 17,60 |
| 45 | Вентилятор ВР80-75 2,5 (0,25/1500) (инв. № 3337). Термодымокамера УК-3 (камера коптильная) (инв. № 3206) | **2 664,00** | 133,20 | 266,40 |
| 46 | Водонагреватель проточный 15кВт (инв. № 3256) | **120,00** | 6,00 | 12,00 |
| 47 | Вышка-тура (2.0х1.2) 5,2 м (инв. № 3451) | **80,00** | 4,00 | 8,00 |
| 48 | Диван угловой с креслом (инв. № 5018) | **88,00** | 4,40 | 8,80 |
| 51 | Дымогенератор (инв. № 3104) | **1 600,00** | 80,00 | 160,00 |
| 52 | Дымогенератор (инв. № 3129) | **1 760,00** | 88,00 | 176,00 |
| 53 | ИРФ-454-Б2М (инв. № 3184) | **800,00** | 40,00 | 80,00 |
| 54 | Камера холодильная 2000х35002240 (инв. № 3281) | **2 400,00** | 120,00 | 240,00 |
| 55 | Компрессор СБ4/С 100LH 20А (инв. № 6009) | **664,00** | 33,20 | 66,40 |
| 56 | Компьютер «CDL-pro» Celeron (инв. № 3192) | **176,00** | 8,80 | 17,60 |
| 57 | Компьютер «CDL-pro» Celeron (инв. № 3191) | **152,00** | 7,60 | 15,20 |
| 58 | Компьютер (комплект) (инв. № 3284) | **408,00** | 20,40 | 40,80 |
| 59 | Компьютер (комплект) (инв. № 3285) | **256,00** | 12,80 | 25,60 |
| 60 | Компьютер (комплект) (инв. № 3286) | **256,00** | 12,80 | 25,60 |
| 61 | Компьютер (комплект) (инв. № 3287) | **256,00** | 12,80 | 25,60 |
| 62 | Компьютер (комплект) (инв. № 3288) | **256,00** | 12,80 | 25,60 |
| 63 | Компьютер (комплект) (инв. № 3389) | **128,00** | 6,40 | 12,80 |
| 64 | Компьютер (комплект) (инв. № 3251) | **88,00** | 4,40 | 8,80 |
| 65 | Компьютер (комплект) (инв. № 3252) | **184,00** | 9,20 | 18,40 |
| 66 | Компьютер (комплект) CEIERON (инв. № 3232) | **184,00** | 9,20 | 18,40 |
| 67 | Компьютер (ПЭВМ «CDL-pro». Монитор «BenQ») (инв. № 3191) | **160,00** | 8,00 | 16,00 |
| 68 | Компьютер ЛОГОС (комплект) (инв. № 3331) | **248,00** | 12,40 | 24,80 |
| 69 | Компьютер ЛОГОС (комплект) (инв. № 3332) | **248,00** | 12,40 | 24,80 |
| 70 | Компьютер ЛОГОС (комплект) (инв. № 3333) | **184,00** | 9,20 | 18,40 |
| 71 | Компьютер ЛОГОС (комплект) (инв. № 3334) | **184,00** | 9,20 | 18,40 |
| 72 | Компьютерный комплекс (инв. № 3250) | **416,00** | 20,80 | 41,60 |
| 73 | Компьютерный комплекс (инв. № 3251) | **416,00** | 20,80 | 41,60 |
| 74 | Компьютерный комплекс (инв. № 3252) | **416,00** | 20,80 | 41,60 |
| 75 | Компьютерный комплекс (инв. № 3453) | **152,00** | 7,60 | 15,20 |
| 81 | Копировально-множительный аппарат XEROX WC PE-16E (инв. № 3149) | **128,00** | 6,40 | 12,80 |
| 82 | Копировальный аппарат AR-5316 (инв. № 3253) | **248,00** | 12,40 | 24,80 |
| 83 | Коптильный конвейер (инв. № 3120). | **3 760,00** | 188,00 | 376,00 |
| 84 | Коптильный контейнер СК-2 (32 шт.) (инв. № 3103) | **3 328,00** | 166,40 | 332,80 |
| 85 | Котел варочный К-50 «Jugema» (инв. № 3280) | **6 000,00** | 300,00 | 600,00 |
| 86 | Котел пищеварочный КЭ-250 (инв. № 3209) | **1 600,00** | 80,00 | 160,00 |
| 87 | Котел пищеварочный КЭ-250 (инв. № 3210) | **1 600,00** | 80,00 | 160,00 |
| 88 | Кран-балка (инв. № 3033). | **720,00** | 36,00 | 72,00 |
| 89 | Линия производства рыбных пресервов (инв. № 3196) | **2 720,00** | 136,00 | 272,00 |
| 90 | Машина вакуум-упаковочная WEBOMATIK E15 (инв. № 3146) | **5 600,00** | 280,00 | 560,00 |
| 91 | Мебель кухонная (инв. № 3440) | **880,00** | 44,00 | 88,00 |
| 92 | Мебель обеденная (инв. № 3441) | **648,00** | 32,40 | 64,80 |
| 93 | Мини АТС (с телеф. аппаратурой 9 шт.) (инв. № 3241) | **960,00** | 48,00 | 96,00 |
| 94 | Напольная вакуум-упаковочная машина WEBOMATIC ECOM (инв. № 3274) | **1 840,00** | 92,00 | 184,00 |
| 95 | Печь камерная (инв. № 3128) | **10 800,00** | 540,00 | 1 080,00 |
| 96 | Печь камерная (инв. № 3143) | **10 880,00** | 544,00 | 1 088,00 |
| 97 | Принтер TSP TTP 244 термотрансферный (инв. № 3335) | **200,00** | 10,00 | 20,00 |
| 98 | Принтер HP Laserjet 1100 (инв. № 3049) | **208,00** | 10,40 | 20,80 |
| 99 | Принтер HP Laserjet 1100 (инв. № 3052) | **96,00** | 4,80 | 9,60 |
| 100 | Смеситель для получения однородного рассола с насосом (инв. № 3339) | **2 080,00** | 104,00 | 208,00 |
| 102 | Тел./факс «Panasonik KXFT 31 RS» (инв. № 3061) | **40,00** | 2,00 | 4,00 |
| 103 | Тел./факс «Панасоник» (инв. № 3093) | **40,00** | 2,00 | 4,00 |
| 104 | Теплосчетчик ТЭМ 05М (инв. № 3207) | **44,80** | 2,24 | 4,48 |
| 105 | Термотуннель ТПЦ-550Р (инв. № 3178) | **880,00** | 44,00 | 88,00 |
| 106 | Факсимильный аппарат KX-FT934RU (инв. № 3254) | **112,00** | 5,60 | 11,20 |
| 107 | Факсимильный аппарат KX-FT934RU (инв. № 3255) | **80,00** | 4,00 | 8,00 |
| 108 | Фасовочно-упаковочная линия (инв. № 3195) | **1 440,00** | 72,00 | 144,00 |
| 109 | Холодильный агрегат АМ-2х6Н 25Y-CL-DK (инв. № 3176) | **1 920,00** | 96,00 | 192,00 |
| 110 | Шкаф ШСС-200 (стерилизатор) (инв. № 3181) | **1 040,00** | 52,00 | 104,00 |
| 111 | Шлифмашина углов. BOSCH GWS 22-230H (инв. № 3343) | **96,00** | 4,80 | 9,60 |
| 112 | Эл. двигатель 5АМ S6-45/1000 (инв. № 3249) | **1 200,00** | 60,00 | 120,00 |
| 113 | Торговый павильон (инв. № 0056) | **1 120,00** | 56,00 | 112,00 |
| 114 | Платформа вес 4D-P-2-1000 с систем. идентификации SI4D-A (инв. № 3338) | **712,00** | 35,60 | 71,20 |
| 115 | Автомобиль ГАЗ 3307 КУПАВА 473800, год выпуска – 2008, рег. № АВ 6423-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый. СКТР 25 терминал ON-LINE (инв. № 3340) | **6 112,00** | 305,60 | 611,20 |
| 116 | Автомобиль ГАЗ 3307 КУПАВА 473800, год выпуска – 2008, рег. № АВ 6424-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый. СКТР 25 терминал ON-LINE (инв. № 3341) | **6 112,00** | 305,60 | 611,20 |
| 117 | Автомобиль ГАЗ 4738, год выпуска – 2005, рег. № АА 3268-3, тип ТС – грузовой фургон изотермический, удовлетворительное техническое состояние, цвет – белый | **4 000,00** | 200,00 | 400,00 |
| 118 | Автомобиль GAZ 3309, год выпуска – 2012, рег. № AI 7768-3, тип ТС – грузовой фургон-рефрижератор, условно-пригодное техническое состояние, цвет – белый | **7 360,00** | 368,00 | 736,00 |
| 120 | Автомобиль GAZ 2752, год выпуска – 2003, рег. № AI 0015-3, тип ТС – грузопассажирский вагон, удовлетворительное техническое состояние, цвет – сине-зеленый | **2 720,00** | 136,00 | 272,00 |
| 122 | Автопогрузчик ДВ-1792, год выпуска – 1988, условно-пригодное техническое состояние (инв. № 3454) | **1 360,00** | 68,00 | 136,00 |
| 123 | Автопогрузчик TOYOTA 62 8FD15 V2700, год выпуска 2008, удовлетворительное техническое состояние (инв. № 3279) | **11 360,00** | 568,00 | 1 136,00 |
| 124 | Прицеп 2ПТС4, 1983 года выпуска, зав. № – нет данных, рег. № ЕВ 3711-1 (инв. № 4005) | **1 840,00** | 92,00 | 184,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский рыбокомплекс», г. Гомель, ул. Шилова, 16. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 534-93-34 Петрушенко Михаил Михайлович, 8 (044) 733-03-49 управляющий в деле о банкротстве Журов Сергей Вячеславович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 5 декабря 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 19 декабря 2018 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» Ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 13.09.2018 г. № 176 (28792). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

# ПРА НАС

## ВАСІЛЬ НАТАЛЛІН

З Васькам мы раслі на адной вуліцы. Ён гады на два старэйшы, жыў з маці, Наталляй, а паколькі быў бязбацькавічам, таму яго і называлі ўсе ў нашай вёсцы проста і зразумела: Васіль Наталлін. Калі да яго імя не дапасоўвалася імя маці, то — Васькам. «Ты з кім гуляў?» — пыталася іншы раз мая маці, калі я вяртаўся з вуліцы, забавіўшыся там, і я тут жа адказваў: «З Васілём Наталліным!» Больш пытанняў не мелася. Калі з ім, то добра, ён дурному не навучыць. Мелася, вядома ж, на ўвазе, што ў яго можна навучыцца толькі ўсім тым навукам, якія неабходны вясковаму мужчыну. Ён усё ўмеў рабіць, за што ні браўся. Жыццё прымусіла хлопца рана стаць дарослым. У школе ж Васіль вучыўся так-сяк. Я дагнаў і перагнаў яго, а Васька потым і зусім кінуў вучобу, таму што неяк уцёрся ў дружбу да старога Ігнацькі, які загадваў вупраджу ў брыгадзе, і пачаў днямі прападаць там. Відаць, за тое, што дапамагаў Ігнацьку, яму налічвалі працадні. Сказаць дакладна не магу, аднак не мог жа ён хадзіць да кладоўкі кожны дзень проста так? Маці што магла адна ў калгасе зарабіць? А хлапчына рос, мужнеў, яго і карміць трэба, і апранаць. Не жартачкі!

А потым мы, ягонае акружэнне, вельмі радаваліся, калі Ваську прызначылі сапраўдным конюхам. У нас было гонару, відаць, больш, чым у яго самога! У Ваські заўсёды віселі на плячы аброць і пуга — не абы што! Цяпер, разважалі мы, дурні, усе коні нашы: якога хочаш — бяры, катайся! Конюх жа наш дружок! Але дзе там! Хоць і прыбягалі мы на выган да коней, якіх пасвіў Васька, але больш забаўляліся ды баілі пра што-небудзь смешнае, каб парагатаць. А калі прасіліся пакатацца на кані, Васька кожны раз знаходзіў прычыну, што сёння нельга: то дзед Ігнацька вунь на агародзе косіць — дык убачыць, то вось-вось брыгадзір будзе ехаць назад з поля — што тады скажа? Прыходзьце, маўляў, заўтра. Назаўтра ўсё паўтаралася... Дапетрылі пазней: Ваську ж проста было шкада коней. Ён бярог іх, як толькі мог, стараўся, каб яны былі сытыя, дагледжаныя.

Аднак пазней з Васькам здарылася бяда. Каля калгаснага саду нехта пакінуў калючы дрот, конь на вялікай хуткасці зачапіўся нагой і спатыкнуўся, а Васька пераляцеў цераз яго, чмякнуўся галавой аб зямлю і страціў прытомнасць. Калі ачуняў, даў слова маці, што так хутка ездзіць больш не будзе.

Потым Васька вывучыўся на трактарыста, служыў у будаўнічых войсках на Новай Зямлі, чым хваліўся пасля дэмабілізацыі нам і расказваў пра свае салдацкія прыгоды. Ці не там, у арміі, вывучыўся на шафёра. Аднак калі вярнуўся са службы і захацеў працаваць у калгасе на «газіку», Наталля ўзняла такі вэрхал, што не перадаць: хопіць, што на кані ледзь не забіўся! Ці нагадаць табе? А калі хочаш мяне адправіць на той свет — ідзі, ездзі!..

Васіль Наталлін быў паслухмяным чалавекам. А тут так атрымалася, што пазнаёміўся з дзяўчынай аднекуль з-пад Доўска і акрыяў! Ён будзе там жыць і працаваць шафёрам! Маці ж далёка. Адкуль ёй ведаць — трактарыст ён ці вадзіцель?

Часта прыязджаў Васька наведваць маці, вядома ж. Хто ж сагрэе яе мацярынскае сэрца, як не адзіны сын. Аднак грузавік заўсёды хаваў дзе-небудзь перад вёскай у зарасніку ці каля крайняй хаты ставіў, а сам тупаў далей пешшу. Маці ж хлусіў: на спадарожнай дабраўся. На трактары ж не прыедзеш — гусенічны ў мяне. Але вяскоўцаў строга папярэджваў: глядзіце ж, не здайце мяне, а то мама не перажыве.

Рэдкі, пагадзіцеся, выпадак: Васіля землякі не здалі!

Наталля ж пайшла на той свет, так і не ведаючы, што яе сын амаль усё свядомае жыццё працаваў на аўтамашыне...

## НЕПАЖАДАНЫЯ СУСЕДЗІ

На першы погляд, жывуць-пажываюць у шматпавярховым доме людзі ціха-мірна. Калі ў адным пад'ездзе, то некаторыя нават вітаюцца паміж сабой. Што да зусім блізкіх суседзяў — тут ужо іншая справа: нават спыніцца і пагаманіць бывае патрэба. Іншы раз і ў госці сходзіць адзін да аднаго. Ці пазычыць што-небудзь. Але ж бываюць выпадкі, калі той жа пад'езд можа паказаць, як кажуць, «тавар» лепшым бокам. Яшчэ як можа! Для гэтага дастаткова нейкай падзеі, якая адбылася б дзесьці паблізу і да якой неадназначна паставіліся б жыхары. Вядома: адным падабаецца адно, другім — іншае, трэцім — яшчэ нешта. Усім не дагодзіш.

Так і ў нас атрымалася. У пачатку лета адна з жанчын пачула тоненькі піск, які данёсся з дзіркі, што была з тарца ганка. Прыслухалася: дык гэта ж сабачаняткі цяўкаюць! Паспрабавала зазірнуць у дзірку, але тут падбегла сучка, усім сваім выглядам горда паказваючы: там мае дзеці, а я іх маці. У дзірку ж заглядваць жанчына перадумала: а хто яе ведае, што ў сабачай галаве! Яшчэ цапне!



Неўзабаве пра тое, што ў іх з'явіліся новыя суседзі, ведаў увесь пад'езд. Тут жа былі прынесены кантэйнеры з малачком і кашкай, хтосьці не пашкадаваў сардэлек і мяса — гэта ўжо для самой маці, а то ж гляньце — скура ды рэбры. Падкармілі яе, назвалі Машай і пачалі з прыемнай трывогай чакаць, калі ўжо пакажуцца на вочы шчанюкі. Цікава было і колькі ж іх там.

Такі дзень настаў: пяцёра! Не адразу тыя прывыклі да людзей, спярша хаваліся, а потым усё ж зразумелі, што нас баяцца няма чаго, і пасмялелі, маглі падоўгу куляцца-забаўляцца, не зважаючы на цікаўных.

Толькі вось не ўсім падабалася такое суседства. Знайшлося некалькі чалавек (жаночага, заўважце, полу!), якія лаяліся з тымі, хто карміў сабачак, маўляў, яны ж вырастуць і тут, пад ганкам, жыць будуць. Што тады? Навошта нам такія суседзі? Выклікалі нават работнікаў камунальнай гаспадаркі, каб дасталі цюцек. Ага, разагналіся! Пліта тут навечна, а ў шчыліну — не пралезеш. Ды і хлопцы разумныя прыйшлі. Для прыліку развялі рукамі, і бывайце здаровы, цёткі!

Прыязджалі і валанцёры. Са сваёй кашай. Вядома ж, таксама па званку. Аднаго шчанюка адразу забралі. Потым неўзабаве і другога, трэцяга... А калі застаўся адзін, Пятро (ён на першым паверсе жыве) лавіў яго і трымаў па начах на балконе ў цяпле.

Неўзабаве ўсе шчанюкі былі ўладкаваны. Знікла і Маша. Ціха і неяк крышачку сумна стала перад пад'ездам. Няма лішняй прычыны адным жанчынам парадавацца, а другім — пасварыцца. Такое ўражанне, што было кароценькае свята, і яно кудысьці раптам падзелася, знікла.

Святы сапраўды доўгія не бываюць. Як, дарэчы, і паўзы паміж імі. Паўлаўна надоечы паскардзілася, што не дае ёй спаць шчанюк, якога трымаюць на другім паверсе ў сваёй кватэры Танька з маладым мужам. «Гаўкае і гаўкае! Гаўкае і гаўкае! Рады не даць!» Хоць сама яна жыве на пятым. Аднак для яе ўзросту слых выдатны! Паўлаўну многія падтрымалі. Хоць сабака ў Танькі жыве даўно і нікому раней не замінаў. А заадно прыгадалі, у каго яны яшчэ дома ёсць. Ого, цэлых два! Вось, аказваецца, адкуль усе нашы беды!.. (Цікава, што ўсе сем'і ў пад'ездзе раней жылі ў прыватных дамах, пакуль не трапілі пад знос, і мелі, вядома ж, сабак.)

Васіль Бялоў апісвае ў адным са сваім твораў, як раней у вёску прывозілі кіно, а сабакі настолькі былі прывязаны да сваіх гаспадароў, што аніяк нельга было выгнаць іх з клуба. Выганяць — а яны ўсё роўна прашмыгнуць і лягуць каля ног. Нехта жартам прапанаваў кінамеханіку збіраць і з сабак грошы за прагляд кінастужкі: месца ж у клубе займаюць.

Баюся, каб такія вось незадаволеныя цёткі не падалі ідэю запісваць сабак у дамавую кнігу і лічыць іх за жыхароў. Месца ж сапраўды займаюць!

## ДЗЕДАЎ ГРЫБ

Грыбы сёлета пайшлі позна. Добра, што хоць так. Думалася ж наогул: усё, прапала паляванне на іх, адганяй думкі, што будзеш хадзіць-блукаць па лесе, дыхаць на поўныя грудзі водарам ігліцы. Яно калі шчыра, то бяды тае — грыбы! Ці мы такія ўжо галодныя, што без іх пражыць не можам? У мяне вунь на кухоннай шафцы кулёк сушаных мінулагодніх ляжыць: бяры, скарыстоўвай. А з тых слоікаў з рыжыкамі, на якія пашчасціла разжыцца летась, добрую палову раздаў сябрам. Дык жа не — у бок лесу паглядаем усё часцей і часцей, нецярпліва: ці ёсць? Ці з'явіліся? Канечне, хто спрачацца будзе: інстынкт. Інстынкт паляўнічага. Цікавы занятак. Не ведаю, як у каго, а ў мяне так. Не скажу, каб любіў асабліва грыбы — так, у ахвотку, можна паласавацца іншы раз імі з бульбачкай і гурочкам. А ў лес цягне. Вось-вось — імена ў лес! Каб пахадзіць, надыхацца свежасцю. Што, здавалася б, перашкаджае? Едзь, хадзі, дыхай! Але ж хто гэта паедзе ў лес, каб проста падыхаць свежым, гаючым паветрам? Без дай прычыны паехаць і бавіць час? Проста так хадзіць-блукаць там? Даруйце! За дурня ж палічаць. Дзівакам назавуць. Дайце грыбы і кошык — тады калі ласка! Тады іншая справа.

Крыху прытомленыя, мы з сынам выйшлі з лесу. Грыбоў набралі поўныя кашы — як панесці. Пашанцавала, бо натрапілі на грыбныя мясціны. Яшчэ, відаць, і таму, што быў звычайны будны дзень, гараджан прыехала мала. Пацяху крочылі да легкавіка, які пакінулі проста каля хаты зусім незнаёмых нам людзей. Каля лесу раней была малочнатаварная ферма, да яе праклалі асфальт, ён і сёння ў парадку. Таму крочылася лёгка. Наперадзе раптам «намалявалася» бабулька — выбралася з-за хмызоў, прыгнутая да зямлі, сухенькая і з кіёчкам, якім падсабляла сваёй не дужа зграбнай хадзе. У другой руцэ старая трымала даволі вялікі абабак. Павіталіся. Разгаварыліся.

— Гэта ж мне дзед абабак даў! Во, паглядзіце, які прыгожы! — пахвалілася бабулька.

— А дзе ж ён, ваш дзед?

— На могілках, дзе ж яму быць... — старая спынілася, павярнулася і паказала вачыма ў бок узлеску: трэба разумець, там яны. — Даўно адна жыву.

— А чаму дзед вам усяго адзін грыб даў? — пацікавіўся сын.

— Ага! Ён разгоніцца! Ён у мяне ашчадны заўсёды быў. Божа барані, каб калі каму лішняе даў і сабе ўзяў. Таму мы добра з ім і жылі. Не бедствавалі, слава табе Госпадзі! — Бабулька ўсміхнулася, і яе твар, густа пасечаны глыбокімі маршчынамі, раптам ажывіўся, быццам пасвятлеў. — Гэта ён па адным грыбе мне наўмысна дае, каб я і заўтра да яго схадзіла. А калі адразу шмат дасці, то чаго я пайду да яго? У старога майго ўсё разлічана, па палічках раскладзена, як некалі інструмент у кладоўцы. Во ўжо парадак любіў!

— А дзеці ў вас ёсць?

— Дзеці ў горадзе. Ай, няпутныя! І ў каго ўдаліся? Стары ж мой не піў яе, халеру, так, як яны. Ці горад іх іспорціў, ці хто?.. Сыны ў мяне... абое рабое... Сыходзяцца, разыходзяцца... Каму п'яніцы трэба?.. А вось тут я і жыву... А вы з горада ж таксама?

— З горада, бабуля.

— І не п'яце ж, бачу! Самастойныя людзі. Во і па грыбы прыехалі. На машыне. А мае — ну іх! — яна махнула якраз той рукой, якой трымала грыб, і шляпка адарвалася, чмякнулася вобзем.

Сын падняў яе, падаў бабулі.

— Памыю, добра будзе. Згатую суп... Ну, шчаслівa вам, добрыя людзі.

Бабулька памкнулася пайсці, але мы прытрымалі яе. Папрасілі, каб вынесла якую-небудзь пасудзіну.

— Дасць дзед ці не дасць яшчэ грыб, тут, як кажуць, бабка надвае варажыла. Ды і калі тое будзе — толькі заўтра. А вось нашых насмажце сёння.

Старая спачатку разгубілася, заўпарцілася, але мы ўсё ж насыпалі ёй грыбочкаў у вынесенае вядзерца.

Калі ўжо ад'язджалі з вёскі, я зноў убачыў яе на тым жа месцы — прыгорбленую, сухенькую і — з непрыхаванай радасцю ў вачах...

**Васіль ТКАЧОЎ.**

# «ЭКА — ГЭТА НЕ СТРАШНА»

## Пра штучнае апладненне, замарозку і іншыя працэдуры

**ПЕРАД парамі, якія не могуць мець дзіця і задумваюцца аб працэдуры ЭКА, паўстае шмат пытанняў. Аб тым, што прапануе сучасная медыцына, у чым прычыны бясплоднасці, як правільна «адкладваць» бацькоўства і чаму нарадзіць усё ж лепш да 40 гадоў, расказала рэпрадуктолаг вышэйшай катэгорыі, загадчык аддзялення планавання сям'і і рэпрадукцыі медыцынскага цэнтра «Ладэ» Алена ПАНКРАТАВА.**



***— Алена Аляксееўна, якія прычыны бясплоднасці?***

— Найперш давайце вызначымся, што такое бясплоднасць. Такі дыягназ ставіцца, калі ў жанчыны да 35 гадоў цяжарнасць не наступае на працягу года рэгулярнага палавога жыцця. Пасля 35 гадоў мы чакаем не больш за паўгода. Прычыны бясплоднасці дзеляцца на некалькі груп: запаленчыя захворванні і непраходнасць матачных труб, генітальны эндаметрыёз, эндакрынныя і імуналагічныя хваробы, мужчынскі фактар. Самая распаўсюджаная прычына бясплоднасці ў жанчын сёння — генітальны эндаметрыёз. Калі ў жанчыны ён у 3-4-й стадыі, то ні пра якія метады лячэння, акрамя экстракарпаральнага апладнення, размова ісці не можа. Чым хутчэй такая жанчына прыйдзе ў клініку і зробіць ЭКА, тым вышэйшая імавернасць наступлення цяжарнасці. З цяжкім эндаметрыёзам шанц наступлення цяжарнасці не больш за 20 %, калі гэта маладая жанчына. Калі ўзроставая, то яшчэ менш. Шмат зараз і мужчынскага бясплоддзя — каля 50 %.

***— Ці ёсць фактары, якія загадзя могуць падказаць, што ў будучым з дзетараджэннем могуць быць праблемы?***

— Калі хлопчык у дзяцінстве хварэў цяжкай «свінкай», верагоднасць бясплоднасці досыць высокая. Калі ў жанчыны былі аперацыі на яечніках, маюцца эндакрынныя праблемы, той жа цукровы дыябет ці захворванні шчытападобнай залозы, парушэнні менструальнага цыкла, узмоцненае аваласенне, атлусценне — гэта фактары рызыкі. Пра непраходнасць ці адсутнасць матачных труб я ўжо згадвала.

***— У такіх выпадках робіцца ЭКА?***

— Для таго каб нарадзіць пры бясплоднасці, не заўсёды патрэбна ЭКА. Пара павінна прыйсці да рэпрадуктолага і абследавацца. Калі ёсць магчымасць лячыць пару медыкаментознымі метадамі, гэта робіцца. Таблеткі, уколы, фізіятэрапія, імунныя фактары, схемы стымуляцыі і схемы для мужчын — самыя розныя варыянты. Калі такое лячэнне не дапамагае, ёсць хірургічны метад: робіцца лапара- ці гістэраскапія. У некаторых выпадках адначасова робіцца дзве аперацыі (так званая сімультанная аперацыя). Яны могуць насіць як дыягнастычны, так і лячэбны характар. Калі хірургічны этап не прывёў пару да наступлення цяжарнасці, ёй прапаноўваюць дапаможныя рэпрадуктыўныя тэхналогіі. Гэта ўнутрыматачная інсемінацыя, ЭКА і сурагатнае мацярынства. Для кожнага з гэтых метадаў існуюць як паказанні, так і супрацьпаказанні.

***— Можна адразу зрабіць ЭКА?***

— Для гэтага павінны быць паказанні: цяжкі мужчынскі фактар, адсутнасць дзвюх матачных труб, сталэйшы рэпрадуктыўны ўзрост. І нястрымнае жаданне зрабіць ЭКА, мінуючы ўсе астатнія метады. На жаль, з такім мы таксама сутыкаемся. Але мы не робім ЭКА, калі ёсць супрацьпаказанні — хваробы, пры якіх супрацьпаказана цяжарнасць, бо гэта звязана з рызыкай для жыцця жанчыны.

***— Наколькі эфектыўныя названыя тэхналогіі?***

— З тэхналогіяй ЭКА я працую 13 гадоў. Калі пачынала, шанцы наступлення цяжарнасці былі 30—35 %. Гадоў праз пяць яны сталі 35—40 %, сёння — 40 %. Ёсць клінікі, дзе атрымліваецца 50—60 % і нават 70 %. Усё залежыць ад таго, якімі тэхналогіямі валодае ўрач і наколькі аснашчана лабараторыя. Але 100 % у ЭКА не будзе ніколі.

***— Да якога ўзросту робіцца ЭКА?***

— Гэта балючая тэма: чым маладзейшая пара, тым большыя шанцы наступлення цяжарнасці. У групе да 35 гадоў шанцы наступлення цяжарнасці будуць пад 70 %. Ад 35 да 40 — не больш за 35—40 %. Ва ўзросце пасля 40, асабліва пасля 42 гадоў, шанцы імкнуцца да нуля.

***— А калі жанчына пасля 40 хоча нарадзіць?***

— Я выдатна стаўлюся да любой жанчыны, якая хоча нарадзіць. Дзеці, гэта, бадай, самае вялікае шчасце, якое нам дадзена. Геніі, між іншым, нараджаюцца толькі ў сталых бацькоў. Жыццё ва ўсіх па-рознаму складваецца. Добра, калі жанчыне пашчасціла выйсці замуж у 18 гадоў, нарадзіць дзетак і далей рабіць кар'еру. Калі жанчына не знайшла чалавека, з якім хацела б мець дзяцей, і сустракае яго ў 42 гады, трэба ж паспрабаваць нарадзіць.

Як вядома, росквіт рэпрадуктыўнай сістэмы жанчыны прыпадае на ўзрост з 18 да 25 гадоў. Пасля 40 гадоў толькі 20 % яйцаклетак могуць апладніцца і скончыцца нармальнымі родамі і здаровым дзіцем. Але ёсць жанчыны, якія і ў 40 гадоў цяжараць без праблем, а ёсць тыя, у каго ў 30 гэта ўжо немагчыма. Сёння, калі жанчына хоча зрабіць кар'еру і адкласці мацярынства на больш позні тэрмін, яна можа замарозіць свае яйцаклеткі і выкарыстоўваць іх пазней — як пэўную страхоўку. Калі ў 40 гадоў не атрымліваецца зацяжарыць, у яе будзе запасны варыянт: замарожаныя яйцаклеткі, шанц наступлення цяжарнасці з якімі значна вышэйшы.

***— Колькі каштуе працэдура замарозкі?***

— Прыкладна 2,5 тысячы беларускіх рублёў. Захоўванне каштуе 23 рублі ў месяц.

***— Пасля якога ўзросту замарожваць яйцаклеткі ўжо позна?***

— Да мяне нядаўна прыйшла пацыентка, ёй 42. Я яе адгаворвала, ды жанчына і сама выдатна разумее, што шанцаў у яе няшмат. «Але калі я не паспрабую, як я буду жыць у старасці?» — кажа яна і мае рацыю. Чым маладзейшая жанчына замарожвае яйцаклеткі, тым больш шанцаў, што ўсё атрымаецца. Пасля 42 гадоў гэта немэтазгодна рабіць. Пасля 49 гадоў мы іх не возьмем, бо ЭКА пасля 50 гадоў не робяць.

> **«Сёння, калі жанчына хоча зрабіць кар'еру і адкласці мацярынства на больш позні тэрмін, яна можа замарозіць свае яйцаклеткі і выкарыстоўваць іх пазней — як пэўную страхоўку».**

***— У суседніх краінах, дарэчы, такога абмежавання няма.***

— Дзіця варта не толькі нарадзіць, але і паспець выхаваць. Таму межы ўстаноўлены не проста так, усё павінна быць больш-менш своечасова.

***— Што павінна ведаць жанчына пры падрыхтоўцы да ЭКА? Гэта сапраўды гарманальны ўдар для арганізма?***

— Варта ведаць, што гэта не страшна, не балюча, і ўсім мы імкнёмся дапамагчы. З бясплоднасцю два варыянты: можна яе не лячыць і ўсё пакінуць як ёсць. Або зрабіць спробы ЭКА і ў вас, магчыма, будуць дзеці. Тут кожны выбірае для сябе сам. Канешне, мы працуем з гарманальнымі прэпаратамі, але нейкіх пабочных уздзеянняў яны не выклікаюць. Калі мы бачым, што штосьці ідзе не так, у любы момант мы можам адмяніць працэдуру. Ніхто не рызыкуе здароўем жанчыны дзеля ўяўнага шанцу наступлення цяжарнасці. Калі жанчына пасля працэдуры трапіла ў стацыянар, гэта ўскладненне. Яны вельмі рэдкія, і кожны ўрач успрымае гэта як асабістую трагедыю.

***— Колькі спроб ЭКА можна рабіць?***

— Колькі заўгодна. У нас ёсць пацыенткі, якія робяць і 10, і 15, нават 20 спроб. Жанчыны цалкам абследаваны, і калі бачым, што ёсць нейкая, напрыклад анкалагічная, схільнасць, мы лепш лішні раз праверым, накіруем на кансультацыю.

***— У вашай асабістай практыцы якая была найбольшая колькасць спроб?***

— Дзевяць. Пацыентка зрабіла тры спробы ў мяне, пасля яшчэ пяць у іншага доктара, пасля зноў прыйшла да мяне. Я паставіла ўльтыматум, што больш не буду рабіць ёй ЭКА, і яна зацяжарыла — двойняй (*усміхаецца*. — **Аўт.**). Калі я вучылася ў Маскве, у адной вядомай балерыны была 22-я спроба.

***— У чым недахопы метаду ЭКА?***

— Адзіны недахоп ЭКА — гэта яго кошт. Гэта нятанная працэдура, яна каштуе ад 4 да 6 тысяч рублёў. І, на жаль, наўрад ці будзе таннець. Гэта высокія тэхналогіі, і яны каштуюць грошай. Раней у мяне былі пацыенты, якія прадавалі трохпакаёвыя кватэры, заставаліся ў аднапакаёвых. Сёння ёсць магчымасць узяць на гэтыя мэты крэдыт. Нямала пацыентак, якія ідуць на ўсё дзеля магчымасці мець дзяцей, іншыя робяць адну спробу і больш не працягваюць. У любым выпадку запатрабаванасць гэтага метаду вышэйшая, чым колькасць пацыентаў, якія могуць сабе яго дазволіць. Але зменшыць кошт ЭКА пакуль немагчыма.

---

Пытанне-адказ

# ЦІ НЕБЯСПЕЧНЫЯ ЛЕКІ З СЕРАБРОМ?

*Сустракаецца інфармацыя, што наначасціцы серабра шкодныя. А між тым серабро ёсць у некаторых леках, напрыклад у пратарголе, каларголе. Значыць, яны небяспечныя? І ці можна без шкоды для здароўя карыстацца сярэбраным посудам?*

**Аркадзь Леанідавіч,**
*Барысаўскі раён.*

Адказвае **ўрач-лабарант Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана КЛІМУК:**

— З даўніх часоў нашы продкі выкарыстоўвалі серабро, і за металам замацавалася рэпутацыя магічнага, які валодае гаючымі і нават містычнымі ўласцівасцямі. На працягу стагоддзяў сярэбраныя ювелірныя ўпрыгожанні звязвалі з надзвычайнай сілай. Гаенне ран, удача і абарона ад злых духаў — з даўніх часоў яму прыпісваюць шмат заслуг. Нашы продкі заўважылі, што віно ў сярэбраных сасудах даўжэй захоўвае свой смак, а сярэбраныя манеты ў вадзе змяншалі верагоднасць атручвання. Сярэбраныя парашкі і настоі наносілі на раны, каб папярэдзіць сепсіс. Серабро выкарыстоўвалася як высокаэфектыўны абеззаражвальны сродак аж да Другой сусветнай вайны, пакуль у шырокі ўжытак не ўвайшлі антыбіётыкі, якія незаслужана выціснулі з нашага жыцця гэты натуральны антысептык як канкурэнта.

Лячэбнае ўздзеянне нітрату серабра заключаецца ў падаўленні жыццядзейнасці мікраарганізмаў. Вядомы супрацьвірусныя і супрацьгрыбковыя ўласцівасці серабра. Пры ўсіх сваіх станоўчых уласцівасцях і падабенстве з антыбіётыкамі серабро не знішчае карысную мікрафлору ўнутры чалавека і не выклікае дысбактэрыёз.

Яно сапраўды ўваходзіць у склад некаторых лекаў, напрыклад каларголу, які прымяняецца ў выглядзе раствору для прамывання ран і вачэй пры кан'юктывіце. Пратаргол выкарыстоўваецца для арашэння галасавых звязак, лечыць насмарк. Ляпіс аказвае прыпякаючае дзеянне, прымяняецца для выдалення мазаляў і бародавак. У гэтых прэпаратах сапраўды ёсць серабро ў выглядзе наначасціц, аднак яны бяспечныя. Таксічнасць серабра — гэта перабольшванне, якое ідзе яшчэ з 1940-х. Максімум, што ад яго можа быць — невялікае пацямненне слізістай ці скуры. Гэта азначае, што нейкаму канкрэтнаму чалавеку серабро не падыходзіць. Але ёсць адчувальныя да серабра людзі, якім яно дапамагае справіцца не толькі з лор-хваробамі, але і іншымі немачамі. Напрыклад, узбагачаная серабром вада здольная не толькі знішчаць вірус, але і падтрымліваць імунітэт, узмацняць яго, што важна ў перыяд масавых прастудных захворванняў. Такая вада дапамагае справіцца з зубным болем, апёкамі і ранамі. Іоны серабра выкарыстоўваюцца і пры прыгатаванні крэмаў, дадаючы ім амаладжальныя ўласцівасці.

Вядома, што пры карыстанні сярэбраным посудам іоны серабра трапляюць у арганізм і замаруджваюць рост і размнажэнне бактэрый у кішэчніку. Існуе старая традыцыя дарыць дзіцяці сярэбраную лыжачку пры прарэзанні першага зуба, і яна мае не толькі сімвалічны, але і практычны сэнс. Даваць першую ежу з такой лыжачкі бяспечна, яна не толькі іанізуе ежу, але і знішчае бактэрыі ў поласці рота і на зубках дзіцяці. Так у малога, які дагэтуль харчаваўся толькі матуліным малаком і цяпер рызыкуе атрымаць інфекцыю з новай ежай, з'яўляецца дадатковая «абарона».

Аднак калі вы збіраецеся набыць сярэбраныя прадметы для выкарыстання ў якасці посуду, то рабіць гэта лепш не ў ювелірных крамах, а ў аддзелах посуду. Тое, што прадаецца ў ювелірных, часцей за ўсё можна выкарыстоўваць толькі для ўпрыгожання інтэр'ера. У складзе такіх прыбораў і посуду могуць быць цяжкія металы, якія здольныя з часам назапашвацца ў арганізме. Есці з такога посуду ці захоўваць у ім прадукты непажадана. Набываючы посуд, паглядзіце сертыфікаты і састаў сплаву. Ніякіх дадатковых металаў і прымесяў у ім быць не павінна. Выбірайце высокую пробу серабра — чым яна вышэйшая, тым чысцейшы сплаў і лепшая якасць. Асаблівая пільна падыходзьце да саставу і пробы сталовых прадметаў, набываючы іх для дзіцяці. У сталовага серабра заўсёды павінен быць гігіенічны сертыфікат. Звярніце ўвагу на пакрыццё серабра: калі яно выкарыстоўваецца для харчовых мэт, то пакрыта можа быць толькі золатам. Родый, лак, эмаль і чарненне — прыкмета таго, што гэты прыбор годны толькі ў якасці сувеніра.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**



# У РЫТМЕ ЖЫЦЦЯ І МУЗЫКІ

Адзіны ў Беларусі майстар, тэхналогію вырабу ўдарна-шумавых інструментаў якога ўзяла пад ахову дзяржава як гісторыка-культурную каштоўнасць, — Аляксандр ХАРКЕВІЧ. У свае 84 гады жыхар вёскі Ваўканосава Круглянскага раёна здзіўляе не толькі пазітыўным жыццёвым настроем, але і працалюбствам, бясконцым багаццем творчай душы — спеўнай, музыкальнай, вясёлай. Дзе б ён ні быў, што б ні рабіў — заўсёды з песнямі, з весялосцю. Без яго драўляных вырабаў — трашчотак, лыжак, ксілафонаў, кастаньетаў, звычайных «пранікаў» не абыходзяцца народныя гурты і ансамблі Кругляншчыны, удзельнікам якіх некалі быў і ён. Асобная размова — звонкія, галасістыя і надзіва лёгкія бубны! Кожны, хто возьме іх у рукі і рытмічна дапаможа гарманісту, лёгка адчуе сябе спраўным барабаншчыкам.

— Удзельнічаў я і ў школьна-калгасным ансамблі «Бяседачка», а таксама ў гурце «Вераснянка» — спяваў, акампанаваў на бубне і лыжках, граў на дудачках і жалейках, на свістульках і на бяросце, азартна танцаваў... А цяпер займаюся толькі вырабам інструментаў, раблю кухонныя наборы, лыжкі-сувеніры, — кажа Аляксандр Харкевіч. — Да мяне на экскурсію прыязджаюць цэлыя групы турыстаў, і кожны наведвальнік хоча нешта атрымаць на памяць.

Жыццярадасны ваўканосавец у дзяцінстве выхоўваўся ў сям'і, якая ведала толк у музыцы: дзед быў класным гарманістам, маці віртуозна валодала і гармонікам, і бубнам, і нават балалайкай. Свой першы ўдарны інструмент — бубен Харкевіч зрабіў яшчэ падчас вучобы ў школе, хадзіў з ім на вяселлі, у валачобнікі і на вячоркі, за што і атрымліваў наганяй ад настаўнікаў. І хоць Аляксандру не ўдалося стаць прафесіяналам-музыкантам — атрымаў дыпломы аўтамеханіка і настаўніка фізкультуры, працаваў у школе, — але сваё жыццё ён шчодра ўзбагаціў народнай культурай.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**







*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении открытого аукциона по продаже объектов государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

**Организатор аукциона:** комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета, г. Минск, ул. Герцена, 2А, каб. 2, тел.: (017) 289 11 27, (017) 200 20 89, (017) 222 44 69.

Аукцион состоится **10 января 2019 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**На аукцион выставляется:**

| | |
|---|---|
| Сведения о предмете аукциона, место нахождения недвижимого имущества | Недвижимое имущество по ул. Омельянюка, 3 в г. Минске и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания.<br>В состав недвижимого имущества входят:<br>– капитальное строение с инвентарным номером 500/С-14640, расположенное по ул. Омельянюка, 3 в г. Минске, назначение – здание специализированное для образования и воспитания, составные части и принадлежности: проезд, 2 дорожки, 6 площадок, ограждение, ворота, калитка, бордюрный камень. Общая площадь капитального строения составляет 750,4 кв. м;<br>– капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1021086, расположенное по ул. Омельянюка, 3 в г. Минске (КК-1-КК-сущ.), назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, протяженность – 33,4 м;<br>– насаждения ограниченного пользования |
| Начальная цена предмета аукциона | 261 015 рублей 95 копеек, из них: начальная цена недвижимого имущества – 122 444 рубля 69 копеек (с понижением на 50 %), начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 138 571 рубль 26 копеек |
| Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета | 52 000 рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с BY13AKBB36429000008700000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код AKBBBY2X, УНП 100048181 комитета государственного имущества Минского городского исполнительного комитета.<br>назначение платежа – **задаток для участия в аукционе** |
| Продавец недвижимого имущества | Минское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «МИНСКЭНЕРГО», 220033, г. Минск, ул. Аранская, 24, тел. (017) 218 42 97.<br>Осмотр имущества потенциальными покупателями производится с участием представителя продавца Борисика Георгия Владимировича – тел.: (017) 246 17 67, (029) 344 01 31; Карасевой Ирины Ивановны – тел.: (017) 246 18 21, (029) 344 01 38; Юневич Оксаны Владимировны – тел. (029) 102 21 65 |
| Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества | Земельный участок площадью 0,4314 га с кадастровым номером 500000000002006563 (в том числе 0,4314 га с ограничениями в использовании земель, находящихся в санитарно-защитных полосах водоводов, и 0,1026 га с ограничениями в использовании земель, находящихся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений);<br>вид вещного права на земельный участок – право аренды;<br>срок аренды – 5 лет |
